ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛЮТАГА 2014 г. ЧАЦВЕР № 27 (27637) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**З беларусам можна пасябраваць за гадзіну**



**Сочым за нашымі ў Сочы!**





**Прызнаемся шчыра: мы чакалі гэтага вечара, верылі, што медаль будзе. Які — стараліся не загадваць, каб не сурочыць. І толькі яна адна ўпэўнена сцвярджала пасля няўдалага нядзельнага спрынту: «Гэта толькі трэніроўка. Усё яшчэ наперадзе. Гонка пераследавання — мая». Менавіта гэта яна казала вашаму карэспандэнту, седзячы ў кабіне фунікулёра, які павольна спускаў нас ад стадыёна да атэляў, гойдаючыся над безданню ў перадгор'ях Каўказа.**

Сапраўды, гэтая гонка — яе. І перамога — яе. І — наша, усіх, хто верыў, спадзяваўся, перажываў, разумеў промахі і зрывы. Чакаў. Перамога абсалютная, чыстая, бліскучая. Не з тых, пра якія кажуць: «на нервах», «на маральна-фізічных якасцях». Гэта прызналі ўсе. І першая Дашу павіншавала яе адвечная саперніца грозная Тора Бергер (алімпійская чэмпіёнка Ванкувера, васміразовая (!) чэмпіёнка свету). Тая Бергер, якая напярэдадні абяцала: «Буду бегчы так, быццам за мной гоніцца зграя галодных сабак». І яна бегла. І прыбегла другой. Але нарвежка нават не бачыла спіны нашай Дашы перад сабой — такі быў адрыў дзвюх наймацнейшых біятланістак свету адной ад другой на фінішнай прамой. «У мяне проста не было шанцаў», — толькі і сказала Бергер пасля гонкі.

А восьшто **сказала сама алімпійская чэмпіёнка** журналістам з дзясяткаў краін, якія доўга і цярпліва чакалі яе пасля цырымоніі ўзнагароджвання:

— Я вельмі шчаслівая. Мая мара ажыццявілася — я стала алімпійскай чэмпіёнкай. Мяне перапаўняюць эмоцыі... Гэты дзень і гэтую перамогу я прысвячаю сваёй мамачцы. Яна перажывала за мяне мацней за ўсіх. Ну што яшчэ звычайна кажуць у такіх выпадках? Мабыць, я была сёння неверагодна спакойная і ўпэўненая. Даўно не адчувала сябе так добра.

СТАР. 8

# ЛЕПШАЯ Ў СВЕЦЕ ДЫПЛАМАТЫЯ

**Перамогі, як у беларускай біятланісткі Дар'і Домрачавай, лепш за ўсякую дыпламатыю садзейнічаюць фарміраванню пазітыўнага іміджу краіны. Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час чаяпіцця ў асяроддзі беларускіх балельшчыкаў з уладальніцай залатога алімпійскага медаля ў гонцы пераследавання, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка быў адным з першых, хто павіншаваў Дар'ю Домрачаву з перамогай. У доме кіраўніка дзяржавы сабраліся балельшчыкі, члены беларускай каманды, куды ў хуткім часе прыбыла і галоўная віноўніца ўрачыстасці. Малодшы сын Прэзідэнта Мікалай падарыў спартсменцы букет кветак. А пасля Дар'ю падхапілі на рукі і доўга качалі, падкідаючы ў паветры.

У сваю чаргу Дар'я Домрачава адзначыла намаганні ўсёй каманды ў дасягненні такога высокага выніку. Паводле яе слоў, для перамогі ў гэты дзень «сышліся ўсе зоркі». Алімпійская чэмпіёнка таксама расказала, што перад пачаткам Алімпіяды спецыяльна вырашыла пабергчыся сябе, а таму адмовілася несці на цырымоніі адкрыцця Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. «Каб захаваць форму, не захварэць. У мяне думка была: я не панясу гэты сцяг на адкрыцці, лепш я фінішую з беларускім сцягам», — адзначыла спартсменка.

«Значыць, панясеш на закрыцці!» — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Гэта твая Алімпіяда», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да Дар'і. Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў упэўненасць, што і іншыя беларускія спартсмены, у тым ліку члены нацыянальнай каманды па біятлоне, здольны заваяваць алімпійскія медалі.



## ЦЫТАТА ДНЯ

**Старшыня Дзяржстандарту Віктар НАЗАРАНКА:**



*«Асноўная наша задача заключаецца ў стварэнні ўмоў, у якіх бы развівалася айчынная інавацыйная прамысловасць, каб яна магла пастаўляць на экспарт якасную канкурэнтаздольную прадукцыю. У гэтым кірунку ёсць нядрэнныя вынікі. Хоць нас усё ж турбуе недастатковая высокая актыўнасць прамысловасці ў тых напрамках, якія сёння важныя для паставак на экспарт, — гэта тэхнічнае рэгуляванне і новыя дакументы Мытнага саюза, укараненне міжнародных стандартаў, якія з'яўляюцца актуальнымі для экспарту нашай прадукцыі ва ўсе рэгіёны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.02.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9690,00 | ■ |
| Еўра | 13210,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 279,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1108,06 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 3° |
| Віцебск | + 2° |
| Гомель | + 6° |
| Гродна | + 2° |
| Магілёў | + 4° |
| Мінск | + 3° |

ISSN 1990 - 763X

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## УСЁ ПРА АДРАСНУЮ САЦЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ

**Хто мае права на штомесячную або аднаразовую сацыяльную дапамогу і якія сёння іх памеры? Ад чаго яны залежаць? Каму прызначаецца дапамога па аплаце паслуг ЖКГ? Колькі разоў можна звярнуцца па дапамогу на падгузкі?..**

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць **намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандру Аляксеевічу РУМАКУ** ў ходзе прамой тэлефоннай лініі **«Падтрымка насельніцтва праз сістэму дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі»**, якая адбудзецца ў рэдакцыі «Звязды» 20 лютага. Тэлефануйце па нумары **(8-017) 287 18 66 з 11 да 12 гадзін.** Папярэднія пытанні можаце задаваць па тэлефоне **(8-017) 292 21 03.**

■ Сацыяльны ракурс

## РАБОЧАЙ СІЛЫ ШМАТ, А КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОТНІКАЎ НЕ ХАПАЕ

**На думку міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны Шчоткінай, рынак працы неабходна збалансаваць**

**Якія змены адбыліся ў працоўным заканадаўстве? Што будзе з зарплатамі і пенсіямі? На што накіравана дзяржаўная сацыяльная падтрымка? Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўваліся на калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі па выніках работы ў 2013 годзе. У ёй узялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік, міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, намеснікі міністраў юстыцыі, інфармацыі, эканомікі; кіраўнікі абласных камітэтаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і іншыя.**

Па словах Марыяны Шчоткінай, рабочай сілы ў краіне шмат, але пры гэтым кваліфікаваных работнікаў не хапае. Таму задача палітыкі занятасці — фарміраванне збалансаванага рынку працы шляхам стымулявання эканамічнай актыўнасці незанятага насельніцтва, зніжэнне дысбалансу паміж попытам і прапановай рабочай сілы, павышэнне канкурэнтаздольнасці рабочай сілы і рэалізацыя прынятай дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці на гэты год.

Марыяна Шчоткіна падкрэсліла, што аплата павінна залежаць ад вынікаў працы, а для гэтага наймальнікі павінны мець магчымасць стымуляваць работнікаў.

СТАР. 2

■ Сталіца

# «МЕЦЬ СУСВЕТНА ВЯДОМУЮ ГАСЦІНІЦУ — ПРЫНЦЫПОВА ВАЖНА ДЛЯ СТАЛІЦЫ»

**Колькі Мінск мяркуе зарабляць на турыстах, ці магчыма яшчэ пабудаваць жыллё ў межах МКАД, чаго каштуе пракласці адзін кіламетр сталічнага метро і колькі сем'яў сёлета атрымаюць арэндныя кватэры... На гэтыя і іншыя тэмы з журналістамі падчас прэс-канферэнцыі гутарыў старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Мікалай ЛАДУЦЬКА.**

У сакавіку-красавіку сталіцу чакае цэлая чарада адкрыццяў новых гасцініц. Але некаторыя пачынаюць працу ўжо цяпер. Так, нядаўна былі ўведзены ў эксплуатацыю гасцініцы на вуліцах Нарачанскай, Алега Кашавога.

— Наступная наша задача, якая павінна быць рэалізавана пасля чэмпіянату свету па хакеі — гэта каб пабудаваныя аб'екты працавалі з нагрузкай і пасля мерапрыемства, — адзначыў Мікалай Ладуцька. — Горад без развіцця ўявіць нельга, але яго маштабы павінны быць суразмернымі з тымі патрэбамі, якія сёння ёсць у гарадскім асяроддзі. Ніхто не застрахаваны ад памылак, таму яны часам здараюцца. Гэта датычыць і сістэмы гарадскога будаўніцтва. Але ў першую чаргу важна, каб непаўторны воблік Мінска быў прыемны яго жыхарам, а таксама шматлікім гасцям, якія будуць прыязджаць у наш горад.

Як паведаміў Мікалай Ладуцька, гарадскія ўлады паставілі сабе максімалісцкую задачу — атрымліваць ад турызму даход у памеры 1 мільярда долараў за год.

Таксама старшыня Мінгарвыканкама звярнуў увагу на тое, што стала прычынай маруднага будаўніцтва вялікага гасцінічнага комплексу «Кемпінскі», перспектыва з'яўлення якога на праспекце Незалежнасці ў свой час выклікала неадназначную рэакцыю гараджан.

— «Падводныя плыні» пры стварэнні гэтага аб'екта заключаліся ў самім яго размяшчэнні (як вядома, будынак стаіць на беразе Свіслачы). У гасцініцы ёсць тры падземныя паверхі. Каб іх пабудаваць, запрасілі кампанію з Запарожжа, якая мае вялікі вопыт стварэння гідратэхнічных збудаванняў. Калі пачалі працу, узнікла шмат праблем з бурэннем, год даваліся рабіць адзін толькі падмурак, — распавёў старшыня Мінгарвыканкама.

Гэтыя акалічнасці нельга было прадугледзець у той момант, калі прымаліся рашэнні па тэрмінах рэалізацыі праекта. Мікалай Ладуцька выказаў думку, што прысутнасць сусветнага гасцінічнага аператара, чые аб'екты пабудаваны ў 140 краінах свету, прынцыпова важная для сталіцы.

— Нас будуць адкрываць праз гэта, — адзначыў старшыня гарвыканкама.

Па словах Мікалая Ладуцькі, зараз у «Кемпінскім» ужо вядуцца работы па абліцоўцы фасаду.

У 2014 годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 70 тысяч кв. м арэнднага жылля і 440 тыс. кв. м жылля з дзяржпадтрымкай для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Арэндныя кватэры атрымаюць каля тысячы сталічных сем'яў.

— Мы збіраемся запрасіць да супрацоўніцтва вядучыя прадпрыемствы, якія маглі б фінансава падтрымаць будаўніцтва жылля для сваіх работнікаў. Гэта актуальна для фарміравання кадравага рэсурсу і замацавання супрацоўнікаў на вытворчасці, — паведаміў Мікалай Ладуцька.

Таксама ён звярнуў увагу, што месца для будаўніцтва ў межах Мінскай кальцавой аўтадарогі з кожным годам усё менш. Па словах старшыні Мінгарвыканкама, у Еўропе ёсць гарады, дзе ўжо досыць даўно амаль не будуюць жыллё. У той жа Празе за год здаецца да 150 тысяч квадратных метраў. Гэты аб'ём рэгламентуецца спецыяльным рашэннем. Мінск тут не будзе першаадкрывальнікам. Да таго ж, на думку Мікалая Ладуцькі, пытанне недахопу жыллёвых ў нас часам ставіцца не зусім карэктна. У сталіцы на паляпшэнне жылых умоў прэтэндуе дзесці 260 тысяч сем'яў, не маюць ва ўласнасці ні аднаго квадратнага метра толькі 40 тысяч з гэтай колькасці.

Мінск імкліва развіваецца, а таму пытанне з'яўлення новых станцый метро актыўна абмяркоўваецца жыхарамі самых розных раёнаў сталіцы. Але работы па пашырэнні сеткі метрапалітэна — справа нятанная.

— Кошт аднаго кіламетра метро на сёння складае ад 50 да 70 мільёнаў долараў. А калі гаварыць пра метро з самым сучасным абсталяваннем, то сума ўзрастае да 100 мільёнаў, — нагадаў Мікалай Ладуцька.

Што датычыць станцыі «Малінаўка», адкрыцця якой даўно чакаюць многія мінчане, старшыня Мінгарвыканкама ўдакладніў, што, згодна з праектам, сапраўдны тэрмін здачы яе ў эксплуатацыю — кастрычнік 2014 года, але перад будаўнікамі пастаянна ставіцца задача тэрміны як мага больш скарачаць. Такім чынам адкрыццё «Малінаўкі» па-ранейшаму запланавана на сёлетні май.

Сёння ўжо пастаўлена задача пачаць праектаваць чацвёртую лінію сталічнага метрапалітэна. Гэта патрэбна для таго, каб паралельна з будаўніцтвам трэцяй лініі рыхтавацца да пачатку работ на чацвёртай.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■

З першых вуснаў

## ГЛЕБА ДЛЯ ПАРАЗУМЕННЯЎ

ПРАМАЯ ЛІНІЯ УПАЎНАВАЖАНАГА ПА СПРАВАХ РЭЛІГІЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ ПРОЙДЗЕ 14 ЛЮТАГА.

У гэты дзень з 9.00 да 15.00 Леанід Паўлавіч Гуляка будзе адказваць на пытанні, якія тычацца міжнацыянальных узаемаадносін і існуючых у Беларусі канфесій. Наша краіна — дзяржава шматнацыянальная, і глеба для дыялогу ствараецца, з аднаго боку дзякуючы талерантнасці беларускага народа, якая выпрацоўвалася стагоддзямі, а з другога — рэгулюецца заканадаўствам (напрыклад, ёсць закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь»). Але Беларусь яшчэ і шматканфесійная краіна (афіцыйна зарэгістравана 25 канфесій і рэлігійных арганізацый). У сваю чаргу пытанні міжканфесійных узаемаадносін таксама адлюстраваныя ў законе — «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». Але жыццё звычайна прапануе канкрэтныя сітуацыі для развяз, разабрацца ў якіх могуць дапамагчы спецыялісты.

«Прамая лінія» Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў праводзіцца не першы раз і звычайна ў людзей шмат практычных пытанняў, на якія хочацца атрымаць кампетэнтныя адказы з вуснаў прадстаўнікоў дзяржавы. **У пятніцу 14 лютага да Леаніда Паўлавіча Гулякі можна звяртацца па тэлефоне ў Мінску: 8-017 284 89 65.**

## СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ЗНОЎ НЕ ЗВАРУХНУЛАСЯ

**Стаўка рэфінансавання ў лютым застанецца на ранейшым узроўні — 23,5% гадавых, паведамілі ў Нацбанку.**

Такое рашэнне прынята праўленнем Нацыянальнага банка. «Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, індэкс спажывецкіх цэн у студзені 2014 года склаў 101,6%. Таму захаванне бягучага ўзроўню стаўкі рэфінансавання пацвярджае антыінфляцыйную накіраванасць грашова-крэдытнай палітыкі», — заяўляюць у галоўным банку краіны. Нацбанк прадоўжыць штомесяц разглядаць пытанне аб узроўні стаўкі рэфінансавання з улікам фактычнай і прагнознай дынамікі інфляцыі і макраэканамічнай сітуацыі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# ...КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОТНІКАЎ НЕ ХАПАЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Дзякуючы такому падыходу на бягучы момант у 38 раёнах краіны зарплата перавысіла 500 долараў ЗША. У лідарах — Мінская і Гродзенская вобласці.

Тэмп росту намінальнай заработнай платы па краіне ў 2013 годзе склаў 37% (5139,4 тысячы рублёў), рэальная заработная плата ў параўнанні з 2012 годам павялічылася на 15,8%. Намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата работнікаў бюджэтных арганізацый у 2013 годзе склала 3791 тысячу рублёў. Павышэнне ўзроўню аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы адбывалася шляхам павелічэння тарыфнай стаўкі першага разраду.

Дзеля сацыяльнай абароны работнікаў катэгорый з нізкай аплатай мінімальная заработная плата штогод вызначаецца ў памеры, не ніжэйшым за памер сярэднядушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек, які дзейнічаў на пачатак года. З 1 студзеня 2013 года МЗП складала 1395 тысяч рублёў, з 1 студзеня 2014 года яна павялічылася да 1660 тысяч рублёў.

Сітуацыя на рынку працы знаходзіцца пад пастаянным кантролем міністэрства. У студзені-снежні 2013 года па садзейнічанні ў працаўладкаванні ў адпаведныя органы звярнуліся 257 тысяч чалавек, з іх зарэгістраваны беспрацоўнымі 158,3 тысячы чалавек. Колькасць свабодных працоўных месцаў у параўнанні з адпаведным перыядам 2012 года знізілася на 18,5% і на 1 студзеня 2014 года склала 50,5 тысячы вакансій. Колькасць беспрацоўных на адну вакансію засталася на ўзроўні 2012 года і на 1 студзеня 2014 года склала 0,4. Агульны ўзровень беспрацоўя на гэты перыяд склаў 0,5%.

### Што новага ў заканадаўстве?

Летась завершана работа па ўдасканальванні працоўнага заканадаўства. Сёлета ў студзені прыняты Закон «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь», які ўнёс карэктывы больш чым у 180 артыкулаў кодэкса. У Законе адлюстраваліся пытанні прававога рэгулявання сферы прафесійнага спорту, паляпшэння эфектыўнасці вытворчасці, бізнесу, выкарыстання працоўных рэсурсаў.

З улікам павелічэння ролі малога бізнесу ў эканоміцы больш чым 45 тысяч мікраарганізацый атрымалі магчымасць заключаць з работнікамі па згодзе бакоў тэрміновыя працоўныя дагаворы без уліку характару работы. Бакі будуць мець права выбару віду працоўнага дагавора. Гэта дасць магчымасць суб'ектам малога бізнесу аператыўна падладжвацца пад змены эканамічнай сітуацыі на рынку працы, а таксама афармляць адносіны з работнікамі паводле заканадаўства, тым самым забяспечваючы ім сацыяльна-працоўныя гарантыі.

Апроч таго, пашырана панацце працы на даму. Цяпер работнік-надомнік можа працаваць не толькі дома, але і ў любым іншым памяшканні на яго выбар, у тым ліку ў іншай месцовасці па-за месцам размяшчэння наймальніка. Пры гэтым будуць выконвацца ўсе патрабаванні працоўнага заканадаўства — заключэнне пісьмовага працоўнага дагавора, у якім будуць змяшчацца ўмовы працы, у тым ліку ўмовы аплаты; рэжым працы і адпачынку, правы і абавязкі бакоў.

Водпуск па доглядзе дзіцяці цяпер можа давацца бацьку ці іншаму сваяку, які працуе. Пры гэтым такі водпуск можна атрымаць не толькі замест маці, якая працуе па працоўным дагаворы, але і ў выпадку, калі яна з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, натарыусам, адвакатам, творчым работнікам, рамеснікам, работнікам у сферы аграэкатурызму.

Удакладняецца і пытанне аб суадносінах водпускаў па доглядзе дзіцяці і па цяжарнасці і родах.

### Умова пенсіі — 10 гадоў стажу

Міністр адзначыла, што адбудзецца плаўная адаптацыя пенсійнай сістэмы. З 1 студзеня павялічаны мінімальны стаж работы з уплатай абавязковых страхавых унёскаў, неабходны для прызначэння працоўных пенсій па ўзросце і за выслугу гадоў — з 5 да 10 гадоў. Ранейшыя ўмовы па мінімальным стажы захаваны для прызначэння датэрміновых пенсій па ўзросце бацькам інвалідаў з дзяцінства, шматдзетным маці, інвалідам з дзяцінства і некаторым іншым катэгорыям грамадзян, а таксама пенсій па інваліднасці і ў выпадку страты кармільца.

Таксама з 1 кастрычніка 2013 года дадзена права на датэрміновую пенсію ў агульнай пенсійнай сістэме работнікам, якія да 1 студзеня 2009 года адпрацавалі не менш за палову спецыяльнага стажу, неабходнага для прызначэння льготнай пенсіі па спісах № 1 і № 2. Іншым работнікам, занятым у шкодных умовах працы ці асобнымі відамі прафесійнай дзейнасці, якія да 1 студзеня 2009 года адпрацавалі менш за палову неабходнага спецыяльнага стажу, дадзена права выбіраць спосаб кампенсацыі за такую працу: фарміраваць права на датэрміновую прафесійную пенсію альбо атрымліваць штомесячную даплату да заробку.

З 1 студзеня павышаны тарыфы ўзносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне за работнікаў, занятых на работах па спісе № 1,— з 4,8 да 9%, па спісе № 2 — з 2,6 да 6%.

Летась у параўнанні з 2012 годам сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце павялічыўся на 37,5% і склаў 2091,5 тысячы рублёў. Рэальны памер пенсіі па ўзросце павялічыўся на 16,3%, сярэднямесячны памер мінімальнай пенсіі па ўзросце стаў большым на 34,4% і склаў 1444,3 тысячы рублёў.

«Ужо больш за 6 тысяч чалавек адмовіліся ад выплаты пенсіі пры дасягненні пенсійнага ўзросту», — паведаміла Марыяна Шчоткіна.

### Сацдапамога — па новых правілах

У сферы сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва летась працягвалася выдаванне малазабяспечаным сем'ям (грамадзянам), а таксама тым, хто знаходзіцца ў складанай жыццёвай сітуацыі, дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. У 2013 годзе яе атрымалі 200,7 тысячы чалавек на суму 372,9 млрд рублёў. 75% ад колькасці атрымальнікаў сацыяльнай дапамогі склалі шматдзетныя і няпоўныя сем'і, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей. Колькасць адзінокіх пенсіянераў і інвалідаў склала 3,6 тысячы чалавек (3,6%).

Сёлета дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога будзе давацца па новых правілах, накіраваных на прафілактыку ўтрыманства. Задача, як і раней, заключаецца ў тым, каб дапамогу атрымлівалі толькі тыя, хто сапраўды маюць у ёй патрэбу. А намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік заўважыў, што вяртання да ранейшага парадку налічэння дапамогі па непрацаздольнасці не будзе. На яго думку, падтрымаць работніка, які мае невялікі памер дапамогі па непрацаздольнасці, могуць прафсаюзы. «Калі чалавек нічога не плаціў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, то і вынуць для яго адтуль нічога нельга»,— лічыць віцэ-прэм'ер.

Падчас выніковай калегіі абмяркоўваліся і іншыя тэмы. Так, было адзначана, што Беларусь рыхтуецца далучыцца да Канвенцыі правоў інвалідаў і праводзіць адпаведную работу ў гэтым кірунку. Закранулася пытанне забеспячэння працай работнікаў, якія трапілі пад аптымізацыю. Станоўчай навіной у сферы дэмаграфіі стаў натуральны прырост насельніцтва, зафіксаваны ўпершыню за 20 гадоў. Першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр Грушнік падсумаваў, што «сістэма працы і сацыяльнай абароны выканала ўсе паказчыкі, запланаваныя ў 2013 годзе».

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

УНП 700049607

**Открытое акционерное общество**

**«Дорожно-строительный трест № 3»**

**сообщает о проведении внеочередного собрания акционеров, которое состоится 26 февраля 2014 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**Повестка дня:**

1. О принятии новой редакции Устава открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться **26.02.2014 г. с 10.00 до 10.45** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — **14.02.2014 г.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 40.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность.

***Справки по телефону: 23 64 87 — Наблюдательный совет.***

■ Старонка з біяграфіі

# ПАМЯТАЦЬ ПРА ВАЙНУ

**Дзень вываду савецкіх войскаў з Афганістана для Валерыя ГАЙДУКЕВІЧА, старшыні Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане і старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў парламента Беларусі па нацыянальнай бяспецы, з'яўляецца, перш за ўсё, днём памяці. Не толькі баявых сяброў, што не вярнуліся адтуль, але і тых, хто заўчасна памёр ужо пасля вайны.**

— 10 снежня 1979 года наш полк, што знаходзіўся ў Віцебскай вобласці, паднялі па трывозе. Мы пераехалі ў Быхаў, адтуль пераляцелі ў Казахстан. Напярэдадні 26 снежня, калі адбылася рэвалюцыя ў Афганістане, мы былі ўжо пад Кабулам. Перад палком паставілі задачу ўстанавіць кантроль над шэрагам аб'ектаў, і мы справіліся з ёю, не страціўшы ніводнага чалавека. Баявыя дзеянні пачаліся ў сакавіку 1980 года. На працягу трох месяцаў да іх пачатку мы хадзілі ў горы, каб прывыкнуць, бо клімат вельмі адрозніваўся ад нашага.

Было не зусім правільна, не зусім прадумана тое, што мы, ваенныя, мала ведалі пра афганскія традыцыі, жыццёвы лад. Перад тым, як прыляцець туды, я нават не ведаў, што такое іслам — ніколі не сутыкаўся з такой рэлігіяй. У Афганістане сітуацыя была вельмі няпростая, бо пераважная большасць насельніцтва была непісьменнай (нават на 2000 год грамату ведалі толькі 43% мужчын і 12% жанчын. — **Аўт.**), і гэтыя людзі лічылі законам толькі тое, што сказаў мула.



З-за няведання традыцый краіны ў нас узнікала маса праблем. Вось такі прыклад. Я стаяў на ахове аэрадрома. Недалёка знаходзіўся кішлак. І мне дакладваюць, што адтуль у наш бок накіроўваецца натоўп. Сапраўды, прыглядзеўшыся, я ўбачыў, што сюды бяжыць натоўп мужчын у белых балахонах. Не відаць, са зброяй яны ці не. Я паглядзеў — наперадзе могілкі. Вырашылі: калі яны выбегуць за край гэтых могілак, адкрыем агонь. А аказалася, гэта было пахаванне: у іх прынята праводзіць чалавека ў апошні шлях бягом. Да таго рубяжа, на якім мы пачалі б страляць, заставалася зусім трошкі.

Сёння вельмі часта гутарка заходзіць пра тое, ці патрэбна было Савецкаму Саюзу ўводзіць войскі ў Афганістан. Я лічу, што гэта было зроблена абсалютна правільна. У той сітуацыі можна было паступіць толькі так, таму што інакш кантроль над краінай усталявалі б амерыканцы. І гэта азначае, што значная частка Савецкага Саюза была б пад іх наглядам.

Сёння Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане аб'ядноўвае прыкладна 13 тысяч воінаў-афганцаў. Асноўныя нашы задачы — гэта псіхалагічная і матэрыяльная дапамога членам саюза; патрыятычнае выхаванне моладзі (воіны-афганцы становяцца пераемнікамі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны).

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# «ЛІЧЫЦЬ НЕМЭТАЗГОДНЫМ ПАВЕЛІЧЭННЕ «ЛЬГОТНЫХ» АБ'ЁМАЎ СПАЖЫВАННЯ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ...»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Па нашай «гарачай лініі» з просьбай дапамагчы даць адказ на свой запыт звярнулася чытачка Ірына Канстанцінаўна Віяленцій, якая пражывае ў пасёлку Мінская фабрыка агародніны. Самастойна знайсці тлумачэнні па праблеме, якая хвалюе тут многіх, па словах заяўніцы, не атрымалася. А датычыцца сітуацыя асаблівасцяў аплаты за электраэнергію ў сувязі з тым, што…**

— У мяне, як і амаль што ва ўсіх іншых суседзяў, якія пражываюць у дамах на дзве кватэры, індывідуальнае ацяпленне. Калісь гэтае жыллё будавала для сваіх работнікаў фабрыка, а пазней яго прыватызавалі. Дык вось, раней для ацяплення быў кацёл, для падагрэву вады — калонка, распальваць якую даводзілася запалкамі. Цяпер жа мы маем катлы, якія адначасова служаць як для ацяплення, так і для падагрэву вады. У іх закладзены прынцып самараспальвання — ад электрычнасці, — даводзіла нам заяўніца. — І вось якая неспадзяванка атрымліваецца: як толькі адкрываеш гарачую ваду, у сістэму паступае халодная. Адначасова спрацоўвае самараспальванне. А паколькі цяпер гарачай вадой карыстаемся часта, выходзіць, што самараспальванне спрацоўвае безліч разоў за дзень. Адпаведна, расходуецца электраэнергія. Прычым значна: пры норме для нашых дамоў у 150 кВт/г, якія аплачваюцца па ўстаноўленых тарыфах, у нас за месяц выходзіць 250–300 кВт/г, а тое і больш. А тое, што спажываецца звыш нормы ў 150 кВт/г, аплачваецца з павышаючым каэфіцыентам 1,3. Вось мы і хацелі б даведацца: ці нельга для нашых дамоў, абсталяваных двухконтурнымі катламі «Баксі», павялічыць нормы спажывання электраэнергіі па вызначаных тарыфах? Катлы завадскія, пазначана, што італьянскія — беларускай зборкі. Значыць, наладжана іх масавая пастаўка, і такая праблема, упэўнены, турбуе не толькі нас. Дапамажыце, калі ласка, разабрацца. Нашы спробы зрабіць гэта плёну не далі.

Рэдакцыя папрасіла даць кампетэнтны адказ на гэты запыт спецыялістаў Міністэрства энергетыкі. Зварот быў разгледжаны, і вось якое афіцыйнае тлумачэнне па сутнасці пастаўленых пытанняў мы атрымалі адтуль.

«Дзяржаўнай праграмай развіцця беларускай энергетычнай сістэмы на перыяд да 2016 года, зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 лютага 2012 года № 194, прадугледжана павышэнне пакрыцця насельніцтвам выдаткаў на аказанне паслуг па энергазабеспячэнні да 2015 года **з давядзеннем яго па электразабеспячэнні да ўзроўню сабекошту** (вылучана ў лісце. — **Аўт.**).

У мэтах рэалізацыі названых палажэнняў была прынята пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23 студзеня 2013 года № 52, у адпаведнасці з якой у краіне прайшла ўкараненне сістэма дыферэнцаванай аплаты насельніцтвам паслуг газа- і электразабеспячэння ў залежнасці ад аб'ёму іх спажывання.

Названая сістэма распрацавана з улікам сукупнага складу камунальных паслуг, якія прадастаўляюцца цэнтралізавана, а таксама выдаткаў на ажыццяўленне камунальных паслуг, што не прадастаўляюцца цэнтралізавана.

Грамадзяне, якія пражываюць у жылых дамах (кватэрах), што маюць прыборы індывідуальнага расходу электрычнай энергіі, **абсталяваных у вызначаным парадку цэнтралізаванымі сістэмамі забеспячэння прыродным газам і не абсталяваных цэнтралізаванымі сістэмамі гарачага водазабеспячэння** (вылучана ў лісце. — **Аўт.**), вызначаюць па выбару найбольш прымальны варыянт арганізацыі самастойнай вытворчасці паслуг гарачага водазабеспячэння (ацяплення), у тым ліку праз:

— індывідуальны ці групавы газавы воданагравальны (ацяпляльны) прыбор;

— ацяпляльны прыбор на цвёрдых відах паліва;

— электрычны воданагравальны (ацяпляльны) прыбор.

Варта адзначыць, што, хоць грамадзяне, якія пражываюць у жылых дамах, дзе адсутнічае цэнтралізаваная сістэма ацяплення і гарачага водазабеспячэння і ўсталяваны газавыя ацяпляльныя катлы, нясуць дадатковыя выдаткі на аплату газу і электраэнергіі для работы катла, яны не аплачваюць цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

Звяртаем увагу, што, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 2012 года № 41 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе», на аплату (цалкам або часткова) жыллёва-камунальных паслуг можа прадастаўляцца штомесячная сацыяльная дапамога сем'ям (грамадзянам) пры ўмове, што іх сярэднедушавы даход па аб'ектыўных прычынах ніжэйшы за ўстаноўлены заканадаўствам крытэрый патрэбы.

Улічваючы выкладзенае, Міністэрства энергетыкі лічыць немэтазгодным павелічэнне «льготных» (якія датуюцца дзяржавай) аб'ёмаў спажывання электраэнергіі для грамадзян, жылыя дамы (кватэры) якіх не абсталяваны ў вызначаным парадку электрычнымі плітамі і сістэмай цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння, у якіх усталяваны электрычныя воданагравальнікі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Эх, дарогі…

# НЕ БУДАВАЦЬ, А РЭКАНСТРУЯВАЦЬ…

**Так выказаўся наконт сёлетніх планаў па развіцці дарожнай сеткі Беларусі выказаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Аляксандр Галаўнёў падчас прэс-канферэнцыі.**

— Сёння сетка дарог у Беларусі сфарміравана, таму будаўніцтва новых, у прынцыпе, не патрабуецца. Галоўнае пытанне цяпер — гэта мадэрнізацыя ўжо існуючых транспартных шляхоў, — падкрэсліў Аляксандр Галаўнёў.

Сярод найбольш важных планаў, якія маюць здзейсніцца ў 2014 годзе ў сферы мадэрнізацыі дарожнай сеткі, — завяршэнне працы над паўднёваўсходнім абходам ля Астраўца, рэканструкцыя моста праз раку Мухавец, а таксама рамонт участкаў дарог М-5 Мінск — Гомель, Р-21 Віцебск — мяжа Расійскай Федэрацыі і М-6 Мінск — Гродна. Дарэчы, наконт апошняй трасы Міністэрства транспарту і камунікацый дамовілася з Сусветным банкам аб далейшым супрацоўніцтве ў галіне дарожнага будаўніцтва. Плануецца, што для рэканструкцыі дарогі М-6 Мінск — Гродна будзе выдзелены крэдыт на 200 мільёнаў долараў. Для гэтага беларускі бок павінен забяспечыць распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі да канца першага паўгоддзя 2014 года.

Да таго ж верагодна, што сродкі на мадэрнізацыю некаторых беларускіх транспартных шляхоў выдаткуюць і іншыя замежныя арганізацыі. Так, па словах Аляксандра Галаўнёва, магчымасцю прыняцця ў канцэсію нашых дарог ужо цікавіліся іспанская, польская і французская кампаніі. Пасля вызначэння аб'ектаў, якія Беларусь пагодзіцца перадаць, будуць праведзены тэндарныя таргі. Кампанія-пераможца павінна будзе за свае ці прыцягнутыя сродкі рэканструяваць дарогу і на працягу 20 гадоў яе абслугоўваць, збіраючы пры гэтым плату за праезд. У той жа час намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог запэўніў, што працягласць платных дарог будзе абмежавана 2–2,2 тысячы кіламетраў (усяго ў краіне 16 тысяч кіламетраў рэспубліканскіх дарог).

Адказваючы на пытанне аб будаўніцтве другой чаргі Мінскай кальцавой аўтадарогі, Аляксандр Галаўнёў паведаміў, што сёлета выдаткоўваць на гэта сродкі не плануецца.

— Нават калі браць у разлік сродкі, якія краіна атрымае дзякуючы ўведзенаму нядаўна транспартнаму збору, яны будуць дзяліцца ў роўных прапорцыях на ўсе дарогі краіны, — адзначыў ён. — Верагодная сума збору — 1,5 трыльёна рублёў, таму тых 700 мільярдаў рублёў, якія маглі б быць выдзелены на другую кальцавую аўтадарогу, — гэта недастатковая сума для пачатку сур'ёзнага будаўніцтва аб'екта.

Таксама Аляксандр Галаўнёў закрануў праблему спрэчных момантаў, якія датычацца працы сістэмы BelToll. Напрыклад, былі выпадкі, калі транспарт сацыяльных устаноў ці дарожных службаў не мог праехаць па дарозе бясплатна.

— Першыя месяцы работы сістэмы сапраўды выявілі некаторыя недасканаласці ў ёй. Таму ў хуткім часе будуць унесены пэўныя змены, якія датычацца парадку функцыянавання BelToll. Думаю, што сацыяльныя пытанні будуць у гэтых зменах улічаны і адлюстраваны, — паведаміў Аляксандр Галаўнёў.

Тым жа, хто памылкова атрымаў штрафы ад BelToll у жніўні-верасні, давядзецца чакаць вырашэння пытання як мінімум месяц. Па словах намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Мінтранса, гэты тэрмін спатрэбіцца для прыняцця рашэння на ўзроўні нарматыўнага прававога акта. Праект дакумента ўжо падрыхтаваны, але ў ім ёсць шмат складанасцяў, якія яшчэ неабходна ўрэгуляваць.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■

■ Запрашальнік

# ЗАКАХАНЫЯ НАД ГОРАДАМ

**Амаль як на вядомай карціне Шагала, закаханыя ў Віцебску могуць «узляцець» над горадам. Такая ўнікальная магчымасць з'явіцца ў Дзень закаханых на вежы сімвала старажытнага Віцебска — ратушы.**

— Узняцца на вежу ратушы будзе магчыма толькі ў гэты дзень — 14 лютага (з 17.00 да 21.00 гадзін). Наверсе будынка можна будзе прызнацца ў каханні ці зрабіць прапанову рукі і сэрца. А таксама запусціць у нябёсы паветраны шарык са сваімі запаветнымі пажаданнямі і проста палюбавацца вячэрнім горадам з вышыні птушынага палёту. Закаханыя пары атрымаюць валянцінку з нумарам, каб удзельнічаць у латарэі. Пераможца ж стане ўладальнікам запрашальнага квітка на ўнікальную выставу «Made in Italy», — паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

Цікава, што гараджане і госці Віцебска таксама змогуць пакінуць запіс у «Кнізе рэгістрацыі закаханых». Наведнікам кожнай экспазіцыйнай залы ратушы гарантуюць сюрпрызы. Запрацуе «Салон чараўніцы», у якім наведнікаў чакаюць карты Таро, варажба на бабах, прадказанне па воску і іншыя забавы. Адкрыецца незвычайнае фотаатэлье. Будзе праведзена і віктарына, падчас якой разыгрыюць галоўны прыз Дня закаханых — падарункавы сертыфікат на 100 тысяч рублёў у кавярню-кандытарскую «Бісквіт».

Арганізатары незвычайнай экскурсіі ў музей таксама прапануюць астралагічны прагноз для закаханых «Як кахаць…» Усе ахвотныя змогуць наведаць і майстар-клас па выцінанцы члена Саюза Майстроў Беларусі Вольгі Арасланавай. У яе вучнёў будзе магчымасць сваімі рукамі зрабіць арыгінальныя сувенірныя паштоўкі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

# СЛОВА Ў СПАДЧЫНУ







**Мноства мастацкіх выданняў з ліку прэзентаваных на XXI Мінскай міжнароднай выставе-кірмашы адрасаваны дзецям. Побач з імі — выданні пра здабыткі традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў, якія застаюцца падрастаючаму пакаленню.**

Гэтыя здымкі зроблены на суседніх стэндах выставы-кірмашу. На фота зверху — вядомы дзіцячы пісьменнік, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра Мікола Чарняўскі падпісвае свае кнігі юным чытачам. На суседнім здымку — удзельнікі фальклорнага дзіцячага гурта з вёскі Капаткевічы, якія прэзентавалі завяршальны том серыі пра традыцыйную мастацкую культуру Гомельскага Палесся і Падняпроўя. Разам з іншымі тэмамі ў гэтым выданні расказваецца пра танцавальны фальклор, традыцыйнае адзенне, народныя гульні — тое, што даследуюць і захоўваюць юныя аматары.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

## Шануй сваё

### СТАРАДАЎНІЯ БУДЫНКІ ШУКАЮЦЬ ІНВЕСТАРАЎ

**Сёння ў Магілёве разглядаецца пытанне аб тым, як вярнуць жыццё будынкам, што знаходзяцца ў цэнтры горада і ствараюць яго гістарычнае аблічча. Вырашана пачаць з пяці з іх, якія з'яўляюцца жылымі. Чатыры пабудаваны яшчэ да рэвалюцыі, адзін у 1953 годзе.**

— Інвестары, якія возьмуцца за распрацоўку праектна-каштарысной дакументацыі і аднаўленне гэтых дамоў, маюць магчымасць пабудаваць тут дадатковыя памяшканні і размясціць там свае офісы ці іншыя аб'екты, — кажа начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёўскага гарвыканкама Ігар Данькоў. — Гэта вельмі прывабная прапанова. Сёння пабудаваць нешта ў гістарычнай частцы горада немагчыма, а купіць — вельмі дорага.

Застаецца дадаць, што будынкі, якія знаходзяцца па вуліцы Першамайскай, Піянерскай і ў Пажарным завулку, павінны захаваць статус жылых, а вось дом па завулку Камісарыяцкаму, № 17 плануецца вывесці з разраду жылых і цалкам аддаць пад стварэнне значнага для Магілёва аб'екта. Надаць другое жыццё магілёўскім будынкам могуць нават замежныя інвестары. Галоўнае, каб іх намеры былі сур'ёзнымі, а густ дазволіў не парушыць самабытны архітэктурны стыль старадаўняй часткі горада.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ВАЛАНЦЁРЫ ЗОЙМУЦЦА СПАДЧЫНАЙ САПЕГАЎ

**Гэтым летам у Ружанах будзе працаваць міжнародны валанцёрскі лагер «Спадчына Сапегаў». Праект пры падтрымцы Пружанскага райвыканкама ажыццяўляецца грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА».**

Удзельнікамі летніка стануць маладыя людзі ад 18 да 30 гадоў з Беларусі, Францыі, Італіі, Швецыі, Украіны і іншых краін.

Яны будуць працаваць на тэрыторыі палаца Сапегаў, які перажывае рэстаўрацыю. Акрамя таго, добраахвотныя памочнікі могуць зрабіць свой унёсак у справу рэстаўрацыі царквы святых Пятра і Паўла і манастыра базыльян у Ружанах.

**Яна СВЕТАВА**

## Інфарм-укол

### Мёд пры захворваннях

**У параўнанні з чыстым цукрам мёд не раздражняе слізістую кішэчніка і лягчэй засвойваецца ныркамі. Мёд — гэта кактэйль з вугляводаў, бялкоў, ферментаў, вітамінаў і мінеральных рэчываў. Ён дзейнічае як натуральны антыбіётык.**

**Пры прастудзе** змешваюць з настоем кветак ліпы, ягад маліны, лісця падбелу (па 1 ст. л. мёду і травы або ягад на 1 шклянку вады). Замест травянога настою можна выкарыстоўваць цёплае малако. Прымаць 3 разы на дзень за 2 гадзіны да яды і перад сном.



**Пры анеміі, сардэчна-сасудзістых захворваннях, хваробах печані, нырак, кішэчніка, жоўцевага пузыра, пры неўрозах (расстройствах сну, хранічнай стомленасці), а таксама мігрэнях** штодня ўжываюць па 100 г мёду (дзеляць на 3–6 прыёмаў). Курс — 1–2 месяцы.

**Пры каліце, гастрыце, язве** прымаюць мёд за 1,5–2 гадзіны да яды: раніцай і вечарам — па 30 г, удзень — 40 г. Можна проста развесці мёд у цёплай вадзе і піць як чай.

**Пры захворваннях дыхальных шляхоў** — па 1 ч. л. кожныя 3 гадзіны. Перад тым, як праглынуць, патрымаць у роце пару хвілін.

*** Мёд — магутны алерген.** Калі вы паелі мёду і пасля гэтага з'явіліся высыпка, пачырваненні, ацёкі, задышка, ваніты ці панос, значыць, ён вам супрацьпаказаны.

### Некалькі фактаў пра вітамін С

**Бескантрольны прыём прэпаратаў вітаміну С пагражае зніжэннем пранікальнасці капіляраў, пагаршэннем зроку, збоямі ў рабоце сэрца.**

Аскарбінавая кіслата — невялікі фрагмент натуральнага вітаміну С, які ўключае руцін, біяфлаваноіды і інш. (кожны з кампанентаў уносіць свой уклад у тэрапеўтычны эфект вітаміну С). Уласна аскарбінавая кіслата спрыяе ўтварэнню калагену, сератаніну з трыптафану, стымулюе сінтэз інтэрферону.

Вітаміны, напрыклад, з апельсінаў засвойваюцца прыкладна на працягу 1,5–2 гадзін. Вітаміны, выпушчаныя ў выглядзе монапрэпарата, засвойваюцца ў 2–3 разы хутчэй, чым у мультывітамінных комплексах. У монапрэпаратах вітамін С захоўваецца практычна ў поўным аб'ёме на працягу ўсяго заяўленага тэрміну захоўвання. У любым выпадку вітамін С у вітамінах захоўваецца лепш, чым у зімовай агародніне і садавіне.

Чэмпіёнамі па колькасці вітаміну С з'яўляюцца: гуава, чырвоны балгарскі перац, клубніцы, чорныя парэчкі, зялёная капуста (брокалі, брусельская, савойская і інш.), цытрусавыя. Большасць спецыялістаў перакананы, што атрымаць неабходную дозу вітаміну С толькі з прадуктаў харчавання надзвычай складана. Паводле звестак амерыканскіх медыкаў, толькі 20–30 працэнтаў апытаных ужываюць агародніну і садавіну ў колькасці, рэкамендаванай дыетолагамі. Акрамя таго, у сучасных прадуктах колькасць вітамінаў значна ніжэйшая, чым павінна быць. Таму спецыялісты рэкамендуюць прапіваць курсамі гэты вітамін — асобна ці ў саставе мультывітамінных комплексаў.

Для прафілактыкі захворванняў і падтрымання арганізма дастаткова 100 мг вітаміну С на дзень (з прадуктаў). Плюс раз на тры месяцы прапіваць курс цягам 14 дзён. Пры першых прыкметах захворвання можна піць вітамін тры разы на дзень (агульная доза — 1000 мг) на працягу тыдня.

Нашкодзіць арганізму можна вельмі працяглым ужываннем дозы звыш 2000 мг на дзень. Перадазіроўка прывядзе да захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

## Гучная справа

# ЗАБОЙЦУ ЛУЧНІЦЫ ВЫНЕСЛІ ПРЫСУД

### Праграміст, які захапляўся ролевымі гульнямі, забіў былую жонку на вачах уласнага сына

**Суд Заводскага раёна прызнаў 28-гадовага мінчаніна вінаватым у забойстве 27-гадовай кіраўніцы мінскага клуба лучнікаў-аматараў Ганны Сярдзечкінай. Бліжэйшыя 15 гадоў свайго жыцця малады чалавек правядзе ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

Абвінавачаны цалкам прызнаў сваю віну. Ён распавёў у судзе, што ў дзень трагедыі гуляў на дзіцячай пляцоўцы з 4-гадовым сынам. Пасля прагулкі адвёў хлопчыка дадому. Там, у калідоры, і адбылася сварка паміж былымі мужам і жонкай. «Я называў канкрэтныя дні, калі хачу бачыцца з сынам, — сказаў у зале суда абвінавачаны. — Яна пачала жорстка адмаўляць».

Жанчына паспрабавала выправадзіць былога мужа з кватэры, але той паваліў яе на падлогу і пачаў душыць. Калі ж зразумеў, што Ганна не страціла прытомнасць, як ён адразу падумаў, а памерла, запанікаваў. Перацягнуў цела ў ванну, дзе кухонным нажом падзяліў яго на часткі, склаў у пакеты для смецця і ў заплечніках вынес з кватэры. На таксі даехаў да лесапаласы, што непадалёку ад яго дома. Там закапаў частку пакетаў, астатнія ўтапіў у Цнянскім вадасховішчы... Пазней мужчына ва ўсім прызнаўся і паказаў, дзе схаваў астанкі забітай.

Паводле слоў абвінавачанага, іх агульны з Ганнай 4-гадовы сын у той вечар знаходзіўся ў суседнім пакоі. Але, як высветлілася ў судзе, хлопчык бачыў, як «мама з татам сварыліся», як мужчына біў жанчыну, паваліў яе на падлогу, а пазней «бачыў, як тата маму перамог».

Па выніках экспертызы раней не судзімы інжынер-праграміст усведамляў свае дзеянні і мог кіраваць імі, а значыць, не знаходзіўся ў стане афекту. «Ён быў з так званых ралевікоў. Гэта людзі, якія мадэлююць рэальнасць, прыдумляючы розныя гульні. Яны гуляюць у банкаўскую сістэму або ў раскрыццё злачынстваў. 50–60 чалавек па некалькі месяцаў могуць развучваць ролі: хтосьці ужываецца ў маску следчага, хтосьці — у судмедэксперта. У іх маса ведаў: ад юрыспрудэнцыі да выжывання ў палявых умовах. Некаторыя з іх губляюць сувязь з сапраўдным жыццём. Калі ў ролевай гульні цябе забілі, то ты можаш уваскрэснуць. Яны забываюць, што ў жыцці ўсё інакш», — распавёў другі, грамадзянскі, муж Ганны Сярдзечкінай.

Стральба з лука была далёка не адзіным захапленнем Ганны. Дзяўчына таксама арганізоўвала святы і мерапрыемствы, удзельнічала ў шматлікіх міжнародных фестывалях і супрацоўнічала з тэатрам оперы і балета ў Мінску. Яна таксама працавала над стварэннем некалькіх рэпартажаў для часопіса National Geographic пра малявядомыя храмы Егіпта і Тыбета. Акрамя таго, дасканала валодала некалькімі мовамі, у тым ліку румынскай, венгерскай, арабскай.

У сваякоў і знаёмых Ганны выклікала неразуменне тое, што забойцу далі толькі 15 гадоў турмы. Чаму ў яго дзеяннях не ўгледзелі асаблівай жорсткасці? Чаму асудзілі па 1-ай, а не па 2-ой частцы артыкула 139 Крымінальнага кодэкса? Санкцыя апошняй больш строгая: ад 8 да 25 гадоў, пажыццёвае зняволенне або смяротнае пакаранне.

Чытаю каментары ў інтэрнэце: сотні людзей лічаць, што немагчыма расцэньваць гэтае злачынства як звычайнае забойства. Калі падразаваны забіваў маці ўласнага сына на яго вачах, а потым спрабаваў схаваць сляды — хіба гэта не асаблівая жорсткасць? Зразумела і жаданне сваякоў ізаляваць маленькага хлопчыка ад «бацькі», які пазбавіў яго маці, на максімальна працяглы тэрмін.



Дарэчы, падобная трагедыя здарылася летась у Маскве. Знікла журналістка Ірына Кабанава. Першым занепакоіўся яе муж. Маўляў, жонка сышла з дому пасля сваркі і не вярнулася. Пазней следчыя высветлілі: у той вечар жанчына не выходзіла з кватэры. Падчас сваркі муж задушыў яе, пасля чаго перанёс цела ў ванну і падзяліў яго на фрагменты. Увесь гэты час у суседнім пакоі знаходзіліся іх агульныя дзеці. Суд прыгаварыў забойцу да 14 гадоў калоніі...

**Надзея ПАЎЛАВА**

# ЧЫРВОНКА
## ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

13 ЛЮТАГА 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15738)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

MISHA FM:

# «РАМАНТЫК ПА ЖЫЦЦІ» ПАМІЖ МІНСКАМ І ПІЦЕРАМ

***— Вы прыехалі з Санкт-Пецярбурга, а што звязвае з Беларуссю?***

— Тут у свой час жылі бабуля з дзядулем, а калі іх не стала, то наша сям'я пераехала ў Расію. І я нарадзіўся ўжо ў Санкт-Пецярбургу.

У дзяцінстве я прыязджаў у Беларусь, потым мая сястра выйшла замуж за беларуса, і я часта гасцяваў у яе. Яна жыве ў Дзяржынску. Быў нават час, калі зімой прыязджаў і падпрацоўваў інструктарам па лыжах (Misha FM — майстар спорту па лыжным дваябор'і. — **Аўт**.).

***— Атрымліваецца, жывяце паміж Мінскам і Піцерам?***

— Так, у залежнасці ад таго, якія справы з'яўляюцца, езджу з аднаго горада ў другі. Я ўжо настолькі прывык да такога ладу жыцця, што, бывае, знаходзячыся ў Санкт-Пецярбургу, разумею, што хачу ў Мінск. Там мая сям'я, сябры, тусоўкі, а тут праца. У кожным з гэтых гарадоў у мяне свая роля, і вельмі добра, калі ёсць такая магчымасць: зрывацца з месца і мяняць «карцінку», сустракацца з новымі людзьмі, альбо сумаваць па сябрах.

***— Як адбылася сустрэча з прадзюсарам?***

— З Дзмітрыем Фамічом — прадзюсарам, салістам і заснавальнікам гурта «Чук&Гек» мы пазнаёміліся ў караоке. Я гасцяваў у сястры, і гэта супала з маім днём нараджэння. Пайшлі з кампаніяй у клуб, святкавалі, весяліліся. І, зразумела, улічваючы, што горад чужы і мяне ніхто не ведае, то гулялі «на поўную». Тут раптам да мяне падыходзяць двое здаровых мужчын. Першая думка: «Што ім ад мяне трэба?»

На той час я меў слабае ўяўленне пра беларускі шоу-бізнес, а яны пачынаюць мне нешта расказваць. Як акazалася, я няблага спяваў і танцаваў — прапанавалі паспрабаваць супрацоўнічаць. На мой погляд, вынікі нядрэнныя.

**(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)**



**Імя гэтага артыста на прасторах беларускага шоу-бізнесу з'явілася нядаўна. Сёння яго кампазіцыі гучаць на радыёстанцыях, кліпы паказваюць на тэлебачанні і ў інтэрнэце. А Misha FM рыхтуецца да выпуску першага альбома «100% LOVE», працягвае заваёўваць новых прыхільнікаў ужо ў Расіі і Украіне і чакае сапраўднага кахання.**

РазМЕРКАВАННЕ

# СВАЯ СЯРОД СВАІХ

## Выкладаць у школе, дзе вучыўся... Як гэта?

**...Калісьці дзяўчынка Даша са Слуцка гарэзліва бегала па школьных калідорах, а ў сачыненнях пра будучую прафесію пісала: «Хачу быць, як Тамара Мікалаеўна, мая настаўніца...» Цяпер Дар'ю ў сценах сярэдняй школы № 12, дзе яна сама вучылася колькі гадоў таму, называюць выключна Дар'яй Аляксандраўнай. Маладая жанчына працуе па размеркаванні першы год, выкладае англійскую і нямецкую мовы.**

...На сцяне ў школьным кабінеце вісіць карта Германіі. Акурат такая, якой мы карысталіся на ўроках нямецкай мовы. «Deutschland liegt in der Mitte Europas...», — адразу ўсплывае ў памяці некалі вывучаны тэкст. А ў гэты час школьнікі, што сядзяць насупраць, чытаюць сказы па-англійску. Кабінет, дзе мы знаходзімся, калі можна так сказаць, «двухмоўны». Тут праводзяцца ўрокі як англійскай, так і нямецкай моў.

**Многія студэнткі, асабліва «платніцы», выкарыстоўвалі веданне моў, каб кардынальна змяніць жыццё. Хтосьці знаходзіў сабе жаніха-іншаземца, хтосьці — працу за мяжой. А Дар'я Падобрая пасля вучобы вярнулася ў Слуцк.**

— У першыя месяцы працы я магла незнарок на ўроку англійскай сказаць нешта па-нямецку і наадварот. Дзеці так здзіўлена на мяне заўжды пазіралі, — усміхаецца Дар'я Падобрая.

Прычына, па якой яна выбрала прафесію настаўніка, зусім не «дынастычная». Мама Дар'і працуе на мясакамбінаце, бацька — кіроўца на «хуткай дапамозе», а брат займаецца ўласным бізнесам.

— Калі сустракаемся з аднакласнікамі і яны чуюць, што я настаўніца, некаторыя глядзяць са здзіўленнем і не разумеюць, навошта мне ўсё гэта. Але, па-мойму, у школе можна і трэба працаваць, — лічыць малады педагог.

Выкладаць у школе, дзе вучыўся сам... Мая суразмоўца тут жа здымае ўсе пытанні на гэты конт. Як кажа Дар'я, пераўтварэнне для сваіх настаўнікаў з вучаніцы ў калегу — зусім не праблема. Усё хутчэй наадварот: вопытныя педагогі шмат што могуць параіць. Зараз у Дар'і ў школе ёсць куратары: Іна Міхайлаўна Калашонак і Святлана Барысаўна Азаркова. Старэйшыя калегі аказваюць дзяўчыне метадычную дапамогу.

А вось тыя веды, якія маладая настаўніца здабывала самастойна, даліся ёй не без намаганняў. У Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце, куды дзяўчына паступіла вучыцца, трэба было засвоіць дзве замежныя мовы: нямецкую, якую вучыла ў школе, і англійскую, якую не ведала раней. Асабліва складаным быў першы курс.

— Рытм вучобы асабіста мне не дазваляў хадзіць па дыскатэках і «адрывацца», але я ад гэтага не надта засмучалася, — кажа Дар'я. — Вучыцца было цікава. Мне, бывае, нават хочацца вярнуцца ў той час.

А ўзгадваць сапраўды ёсць што. Па-першае, заняткі ў будучых педагогаў часта вялі запрошаныя з Германіі выкладчыкі. Напрыклад, Дар'і асабліва запомніўся адзін з іх, па імені Штэфан. Ён вельмі цікавіўся нашай культурай і ў якасці заданняў прасіў студэнтаў напісаць для яго па-нямецку колькі слоў пра мясцовыя традыцыі. А яшчэ студэнты мелі магчымасць з'ездзіць на бясплатную моўную стажыроўку ў Германію. Многія студэнткі, асабліва «платніцы», выкарыстоўвалі веданне моў, каб кардынальна змяніць жыццё. Хтосьці знаходзіў сабе жаніха-іншаземца, хтосьці — працу за мяжой. А Дар'я Падобрая пасля вучобы вярнулася ў Слуцк.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**



Маладая настаўніца Дар'я Падобрая хоць і строгая, але справядлівая.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Агульная мова

# «З БЕЛАРУСАМ МОЖНА ПАСЯБРАВАЦЬ ЗА ГАДЗІНУ»

**Падчас мінулай уступнай кампаніі студэнтамі Белдзяржуніверсітэта сталі 1119 замежнікаў. Гэта рэкордны паказчык за ўсю гісторыю ВНУ, хоць жыхары сталіцы ўжо прызвычаіліся бачыць на гарадскіх вуліцах студэнтаў з Кітая, Туркменіі і іншых краін. Трыццацігадовы японец Хітошы Танака, другакурснік Інстытута журналістыкі БДУ, таксама прыехаў у Беларусь менавіта па веды. Карэспандэнты «Чырвонкі» сустрэліся з Хітошы-санам і даведаліся, як яму жывецца ў Мінску, што ўразіла яго ў Беларусі і, вядома, пагаварылі пра Ніпон (так сваю Радзіму называюць самі японцы).**

Фота Надзеі БУЖАН.



***— Хітошы, гэтай восенню на канферэнцыі па падвядзенні вынікаў практыкі ты ўразіў студэнтаў Інстытута журналістыкі сваёй рускай мовай. Адкуль такія веды?***

— О, гэта вельмі доўгая гісторыя. Напачатку 2000-х я жыў у горадзе Кобэ непадалёк ад Осакі, працаваў у мясцовым рэстаране. Аднойчы я сачыў за спаборніцтвамі па тайскім боксе. Адзін з вельмі папулярных у Японіі байцоў — Аляксей Ігнашоў (дарэчы, беларус) — пасля бою даваў інтэрв'ю на рускай мове. Я пачуў яе і, можна сказаць, закахаўся. На Алімпіядзе 2004 года ўжо хварэў за зборную Расіі. Набыў сабе пераклады кніг рускіх класікаў, напрыклад, Дастаеўскага, і пачаў чытаць. Яшчэ глядзеў расійскае кіно, мне падабаюцца фільмы з Сяргеем Бадровым: «Брат», «Брат-2» і больш за ўсё — «Каўказскі палоннік».

Нарэшце я кінуў сваю падпрацоўку ў рэстаране і пайшоў вучыцца — у Такійскі інстытут рускай мовы. Пасля года навучання стажыраваўся ў Маскве. Мне вельмі спадабалася атмасфера, сама краіна. Я планаваў працягваць навучанне, але нечакана адбылася бяда. Мая маці цяжка захварэла, і трэба было тэрмінова шукаць любую працу, зарабляць грошы, бо ў мамы нікога, акрамя мяне, няма. Я ўладкаваўся на завод кампаніі Hitachi, а вывучэнне мовы закінуў. Атрымліваў шмат грошай, але задавальнення зусім не было. Нарэшце маці ачуняла, але працу на заводзе я не кідаў. І аднойчы яна мне сказала: «Хітошы, твой твар быццам мёртвы. Табе трэба займацца тым, што ты любіш». Тады я звольніўся з працы і зноў пайшоў вучыцца, гэтым разам на курсы. Паралельна падпрацоўваў у школе — там займалася рускамоўная дзяўчынка з Туркменістана, і ёй патрэбна была дапамога з японскай мовай.

**(Заканчэнне на 7-й стар. «ЧЗ».)**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 02 2014 г.

*Студэнцкая мабільнасць*

# ЦІ ЁСЦЬ У БАЛОНСКАГА ПРАЦЭСУ «ПАБОЧНЫЯ ЭФЕКТЫ»?

**У наступным годзе ў Беларусі з'явіцца яшчэ адна магчымасць далучыцца да Балонскага працэсу. У 2012 годзе, нагадаем, наша заяўка задаволена не была. Ці паспее беларуская вышэйшая школа вырашыць усе праблемныя пытанні, якія перашкаджаюць яе ўваходжанню ў агульнаеўрапейскую адукацыйную прастору? Днямі ў БДУ прайшоў міжнародны семінар «Эразмус Мундус» як каталізатар інтэрнацыяналізацыі адукацыі: абмен лепшым вопытам і выяўленне новых перспектыў» з удзелам больш як 100 вучоных і супрацоўнікаў ВНУ з 19 краін.**



Сёння Балонскі працэс аб'ядноўвае ўжо 47 краін. Расія далучылася да Балонскага працэсу ў 2003 годзе: Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова і Украіна — у 2005-м, Казахстан — у 2010-м. Такім чынам, усе партнёры Беларусі па ЕўрАзЭС — ужо ўдзельнікі Балонскага працэсу.

**Першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхаіл ЖУРАЎКОЎ** упэўнены, што другая спроба далучэння да Балонскага працэсу будзе для Беларусі больш удалай.

— Усе нашы студэнты вельмі чакаюць гэтай падзеі, — канстатаваў ён. —



Безумоўна, студэнты і сёння ўдзельнічаюць у міжнародных праграмах абмену. Толькі летась выязджалі за мяжу па розных праграмах каля 1,5 тысячы нашых выкладчыкаў і студэнтаў.

Калі казаць аб праграме «Эразмус Мундус», то ў ёй з аднаго боку ўдзельнічаюць універсітэты з пяці краін СНД (Беларусі, Малдовы, Украіны, Арменіі і Азербайджана) і Грузіі, а з другога — універсітэты краін Еўрапейскага саюза. Сродкі на замежную стажыроўку выдзяляе Еўрапейская камісія. Працягласць стажыроўкі для аспірантаў вагаецца ад 3 месяцаў да 3 гадоў. Для супрацоўнікаў ВНУ — ад аднаго месяца да трох гадоў. Для студэнтаў — адзін або два семестры.

Большасць з тых, хто выязджае па абмене, — гэта студэнты факультэта міжнародных зносін, юрыдычнага, эканамічнага факультэтаў, а таксама факультэта філасофіі і сацыяльных навук. Прычына — высокі ўзровень валодання англійскай мовай. Безумоўна, ёсць сярод тых, хто адпраўляецца павышаць свой узровень ведаў за мяжу, і фізікі, хімікі, географы, аднак гуманітарыяў ва ўсіх абменах больш. Яны самыя мабільныя, і гэтая тэндэнцыя прасочваецца не толькі ў нас, але і ва Украіне, і ў Расіі.

У сваю чаргу ў Белдзяржуніверсітэт па праграмах міжнародных абменаў летась прыехалі больш як 300 замежных студэнтаў і выкладчыкаў. Замежныя студэнты едуць вывучаць да нас рускую мову, усходнееўрапейскую гісторыю і культуру, права, эканоміку, радзей — фізіку, матэматыку, інфарматыку, экалогію...

Балонскі працэс сёння адкрыты для ўсіх краін, якія жадаюць у ім удзельнічаць, таму імкненне Беларусі, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, стаць яго часткай, цалкам лагічнае і натуральнае.

**Здараецца, што больш выгадна рыхтаваць пэўных спецыялістаў за межамі краіны ў іншых ВНУ, чым ствараць на радзіме ўмовы для іх падрыхтоўкі.**

Як вядома, ёсць некалькі прынцыпаў Балонскага працэсу. Адзін з іх — гэта двухступеньчатая сістэма вышэйшай адукацыі. Падрыхтоўка па многіх спецыяльнасцях у беларускіх ВНУ ўжо пераходзіць на формулу 4+2: чатыры гады на першай ступені і два гады навучання ў магістратуры. Летась на другой ступені вышэйшай школы было адкрыта 45 новых спецыяльнасцяў, у тым ліку 34 — для практыка-арыентаванай магістратуры. Аднак, калі ступень магістра ёсць ва ўсіх краінах, што далучыліся да Балонскага працэсу, то ступень спецыяліста, якая прысуджаецца ў нас пасля першай ступені навучання, не вельмі зразумелая для еўрапейцаў — для іх больш звыклая ступень бакалаўра. Беларусы ў гэтым праблемы не бачаць, паколькі сам прынцып двухступеньчатай сістэмы вышэйшай адукацыі захоўваецца. Але прызнаюць, што ёсць праблема з пошукам на рынку працы нішы для магістрантаў. Сёння ў магістратуры навучаюцца 7 тысяч чалавек, але дагэтуль для іх не распрацаваны пералік першасных пасадаў і не вызначаны для працадаўцаў яўныя перавагі магістраў перад спецыялістамі.

Адна з галоўных пераваг Балонскай ідэі — магчымасць больш рацыянальна выстраіць усемагчымыя адукацыйныя траекторыі. Здараецца, што больш выгадна рыхтаваць пэўных спецыялістаў за межамі краіны ў іншых ВНУ, чым ствараць на радзіме ўмовы для іх падрыхтоўкі. Да таго ж уступленне ў Балонскі працэс дае магчымасць знаёміцца з перадавым замежным вопытам і запазычваць лепшае шляхам абмену выкладчыкамі і студэнтамі.

— Для нас вельмі важна, каб і Беларусь далучылася да Балонскага працэсу. Мы таксама бяром на сябе абавязацельствы дапамагчы ёй у гэтым, — падкрэслівае **супрацоўніца офіса міжнароднага аддзела Балонскага ўніверсітэта Лічыя ПРАЗЭРП'Ё**. — Што датычыцца часу далучэння, то я не магу сказаць дакладна, калі гэта адбудзецца. Магчыма, нават раней, чым мы плануем.

Галоўнай перашкодай на шляху ўступлення ў Балонскі працэс, па словах Лічыі Празэрп'ё, з'яўляецца несумяшчальнасць беларускай і еўрапейскай сістэм ацэньвання. У Еўропе дзейнічае сістэма крэдытаў, але беларускія студэнты скардзяцца, што, калі яны вяртаюцца пасля стажыроўкі на радзіму, у Беларусі ім не могуць залічыць крэдыты, атрыманыя ў Еўропе.

— Без гнуткасці з абодвух бакоў у гэтым пытанні праграмы абмену могуць спыніцца, — папярэджвае прадстаўніца Балонскага ўніверсітэта. — Між іншым, студэнты, якія прыязджаюць да нас з Беларусі, — цудоўныя. Мы вельмі высока ацэньваем узровень іх падрыхтоўкі: выдатных вынікаў яны дасягаюць, нават калі навучаюцца на італьянскай мове. Мы хацелі б і далей прымаць у сябе беларусаў.

Што датычыцца асцярогі наконт уцечкі з Беларусі высокакваліфікаваных кадраў у іншыя краіны, то, на думку Лічыі Празэрп'ё, гэта выдуманая пагроза.

— Студэнты, якія прыязджаюць да нас на стажыроўку, цудоўна ведаюць, што тэрмін іх знаходжання строга лімітаваны. І ў нас яшчэ не было ніводнага выпадку, каб беларускія студэнты не вярнуліся ў свае ВНУ. Упэўнена, што яны бачаць перспектывы для ўласнай самарэалізацыі ў сябе на радзіме, у той час як у нас працаўладкавацца замежным грамадзянам вельмі праблематычна. Усім вядома, што ў Балонскага працэсу ёсць як свае плюсы, так і свае мінусы. Таму мы бачым сваю задачу ў тым, каб знайсці разумны баланс паміж новымі магчымасцямі і нацыянальнымі прыярытэтамі. Балонскі працэс для нас — не самамэта, — падкрэслівае **міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ**. — Ва ўмовах глабалізацыі эканомікі ёсць неабходнасць састыкоўкі сістэмы адукацыі Беларусі з сістэмамі іншых краін. Балонскі працэс прапануе варыянт універсітэцкай адукацыі, які адпавядае патрэбам сучаснага тэхналагічнага ўкладу. Але ўсе рэформы карысныя тады, калі вядуць да павышэння якасці адукацыі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з сайта БДУІР.**

**НАША ДАВЕДКА:**

*Балонскі працэс — добраахвотнае супрацоўніцтва адукацыйных сістэм еўрапейскіх краін, скіраванае на стварэнне агульнаеўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі.*

*Балонскі працэс стварае спрыяльныя ўмовы для максімальна спрошчанага перамяшчэння студэнтаў і ўладальнікаў дыпломаў у межах агульнай адукацыйнай прасторы, спрашчае ўзаемнае прызнанне кваліфікацый і адпаведных дакументаў аб вышэйшай адукацыі, спрыяе ўзаемадзеянню паміж ВНУ ў адукацыйнай і даследчай дзейнасці і інш.*

**Якія стыпендыі ERASMUS MUNDUS можна атрымаць у Еўропе:**

Бакалаўрыят — 1 000 еўра за месяц
Магістратура — 1 000 еўра за месяц.
Аспірантура — 1 500 еўра за месяц.
*Выкладчыкі — 2 500 еўра за месяц.*
*Акрамя гранта, стыпендыяту аплачваюць праезд да ВНУ і назад і страхавы поліс на ўвесь час навучання.*

# СВАЯ СЯРОД СВАІХ

**(Заканчэнне.Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Прыезд па размеркаванні менавіта на малую радзіму — гэта і супадзенне, і маё жаданне адначасова. Ва ўніверсітэце я даведалася, што ёсць заяўка з майго горада. Да таго ж вярнуцца сюды былі і асабістыя прычыны, — распавядае настаўніца. — «Асабістыя прычыны» — гэта каханы муж, з якім пазнаёмілася яшчэ ў школьныя часы. Таму застацца ў Слуцку — відаць, гэта быў лёс.

Да напружанага графіка Дар'і ў сям'і, на шчасце, ставяцца з разуменнем.

— З гэтага паўгоддзя мая нагрузка — 30 гадзін на тыдзень. Гэта значыць, што ў школе я з 8 гадзін да 15.30, калі няма курсаў. З імі я затрымліваюся і да паловы шостай вечара. А дома яшчэ трэба скласці планы ўрокаў на наступны дзень, — кажа настаўніца.

Яна цяпер вядзе заняткі ў трэцім, шостым і дзявятым класе. Плюс курсы нямецкай мовы ў дзіцячым садку. Калі параўноўваць імпэт да вывучэння замежнай мовы ў такіх розных па ўзросце дзяцей, то, як кажа Дар'я, самыя маленькія — найбольш старанныя вучні:



Падчас заняткаў пяцікласніца Яна Вечар — самая актыўная.

— У іх чамусьці найлепшыя вынікі. Можа, таму, што ўрокі можна праводзіць у форме гульні. Некаторыя дзеткі настолькі захапляюцца вывучэннем мовы, што часам інтуітыўна здагадваюцца пра значэнне слова, калі разумеюць, што яно мае ў сваім саставе ўжо вядомы ім фрагмент.

Большасць бацькоў сёння жадае, каб іх дзеці вывучалі менавіта англійскую мову. Нямецкую яны лічаць не такой перспектыўнай. Але для малых англійская здаецца больш складанай з-за вымаўлення. Яны часта не разумеюць, чаму словы гучаць не так, як яны напісаныя. Падлеткі ж любяць прадэманстраваць характар, і хоць розніца ва ўзросце ў настаўніцы і яе самых старэйшых вучняў не надта вялікая, Дар'я кажа, што з неспадзяванымі капрызамі спраўляецца навучылася. Галоўнае — умець забываць пра непрыемнасці, каб на наступным уроку ад іх і следу не засталося. А яшчэ не сакрэт, што сённяшнія дзеці «на ты» з інфармацыйнымі тэхналогіямі, амаль у кожнага — планшэты і смартфоны. І часам гэта перашкаджае вучобе. Навошта завучваць значэнне слова, калі яго можна лёгка даведацца з дапамогай інтэрнэт-перакладчыка? Можна да заняткаў і не рыхтавацца. Сама ж настаўніца перад тым, як прыйсці да дзяцей у клас, доўга рыхтуецца.

Як кажа Дар'я, раней, яшчэ да паступлення ва ўніверсітэт і некаторы час пасля, у яе было хобі — танцы. Дзяўчына наведвала танцавальны калектыў «Канфеці». На жаль, цяпер на любімы занятак часу не хапае. Нават выхадныя ў Дар'і занятыя: наведвае аўташколу. На пытанне аб грашовай матывацыі маладая настаўніца адказвае:

— Апошняя зарплата, якую я атрымала, — крыху больш за 3 мільёны рублёў. Вядома, любому маладому чалавеку перш за ўсё хочацца мець добрыя грошы, бо шмат што трэба купіць, каб наладзіць жыццё. Але ж і любоў да сваёй справы ніхто не адмяняў. Я адчуваю сапраўдную радасць, калі дзеці прыходзяць пасля канікул і памятаюць усё, што вучылі ў мінулай чвэрці.



Нават на перапынках Дар'я Аляксандраўна з задавальненнем падтрымлівае стасункі са сваімі вучнямі.

...Напрыканцы Дар'я прызналася, што толькі калі сама аказалася ў ролі настаўніцы, зразумела, наколькі цяжкая гэта праца.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Мінск — Слуцк — Мінск.*

«Хуткі» лёд

# ШОРТ-ТРЭК — ГЭТА ВАМ НЕ НА «ВЕЛІКУ» КАТАЦЦА...

**Сёлетнія Алімпійскія гульні сталі сімвалічнымі для нашых канькабежцаў. Беларусь упершыню прадстаўлена ў шорт-трэку, які яшчэ ніколі не прыносіў нам буйных перамог. Краіну прадстаўляюць двое спартсменаў. Пакуль Вольга Талаева і Максім Сяргееў штурмуюць сочынскі лёд, Марыя КУЛЬКО, майстар спорту, трэнер, бліжэй знаёміць нас з гэтым дынамічным і відовішчным відам спорту.**

— Нягледзячы на Алімпіяду, графік заняткаў у нашай школе не змяніўся, — пасля чарговай трэніроўкі кажа Марыя Кулько, выпускніца Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. — Аднак я таксама гляджу Гульні, перажываю за расійскіх канькабежцаў. Праўда, у іх вельмі моцныя канкурэнты. Паўднёвая Карэя, Галандыя, Кітай, Італія — краіны, якія традыцыйна выстаўляюць на буйных спаборніцтвах класных канькабежцаў. Расіянам будзе нялёгка ў барацьбе за медалі. Што тычыцца нашай каманды, Максім ужо завяршыў спаборніцтвы на дыстанцыі 1500 м і заняў 27-е месца. Вольга пабяжыць 15-га лютага. Спадзяёмся, яна выкладзецца на ўсе 100 працэнтаў і пакажа добры вынік.



**— Дарэчы, я даўно ведаю, што ў Віцебску выхоўваюць хакеістаў, баскетбалістаў, футбалістаў. А вось навіна пра аддзяленне шорт-трэка мяне вельмі здзівіла...**

— У Беларусі шорт-трэкам займаюцца яшчэ ў Гомелі, Оршы, Мінску. Але менавіта Віцебск трэба лічыць базавым месцам для падрыхтоўкі нашай зборнай. Дарэчы, Максім Сяргееў нарадзіўся ў Віцебску, пачынаў у нашай школе зімовых відаў спорту «Алімпіец». Пасля разам з маці ён пераехаў у Мінск і ўжо там працягнуў займацца шорт-трэкам. Вольга раней таксама трэніравалася ў Віцебску, а цяпер больш часу праводзіць на трэніровачных зборах у Польшчы.

**— Цікава, а з чаго ўсё пачыналася?**

— Спачатку на стадыёне «Дынама», які знаходзіўся на месцы цяперашняга цэнтральнага спартыўнага комплексу, залівалі лёд на адкрытай пляцоўцы, а ўжо пасля спартсмены пачалі трэніравацца ў пабудаваным лядовым палацы. У шорт-трэк я трапіла ў 1998 годзе — пасля каратэ, шашак і танцаў. Самае цікавае, што гэтымі відамі спорту я займалася некалькі гадоў аднachасова і толькі пасля зразумела, што шорт-трэк — менавіта тая справа, у якой у мяне нешта атрымліваецца. У 18 гадоў мне прысвоілі званне майстра спорту. Разам з нацыянальнай зборнай я ездзіла на чэмпіянат Еўропы і заняла 8-е месца ў эстафеце. Праўда, пасля вырашыла пакінуць спорт. Прычына? Дзіцячыя крыўды ад чалавечай несправядлівасці. Надакучыла слухаць пастаянныя абяцанні. Цяпер разумею, што паступіла насамрэч па-дзіцячы. Увесь гэты час вучылася ва ўніверсітэце і прадавала вопратку ў гандлёвым цэнтры. Потым зацяжарала, і Таццяна Рыгораўна Паўловіч, мой трэнер, прапанавала паспрабаваць сябе ў трэнерскай рабоце. Дэкрэт дома не да канца даседзела, выйшла на працу, калі сыну споўнілася 7 месяцаў.

**— Дарэчы, як «адваёўваеце» дзяцей у хакея і футбола?**

— Размаўляем з дзеткамі ў сярэдніх школах, сустракаемся на спартыўных пляцоўках, запрашаем праз знаёмых і сяброў. На жаль, сёння шорт-трэк не вельмі папулярны ў Беларусі. Людзі часам блытаюць нас з-за назвы з іншымі дысцыплінамі і называюць веласіпедыстамі, лыжнікамі. Але мы спадзяёмся, што ўдзел нашых спартсменаў у Алімпіядзе зробіць шорт-трэку добрую рэкламу.

**— Умовы ў Віцебску дазваляюць рыхтаваць будучых чэмпіёнаў?**

— Не вельмі. Мы нават не маем сталага графіка працы на лёдзе. А таму трэніроўка можа пачацца і а 7 гадзіне раніцы, і позна вечарам. Зразумела, далёка не ўсім бацькам гэта падабаецца. Лёд у нашым палацы рыхтуюць для хакейных матчаў, а таму для шорт-трэка ён занадта цвёрды. На занятках можна нават змерзнуць! Што тычыцца экіпіроўкі, дзеткі прыходзяць на ўсё гатовае. За інвентар, як і за заняткі, плаціць не трэба. Наша федэрацыя экіпіруе таксама трэнераў, спартсменаў. Аднак ёсць рэчы, якія мне зараз трэба набыць самой, — брускі і камні для завострывання канькоў, шлем і пальчаткі. За ўсё трэба выкласці з кішэні 150 долараў.



**— Марыя, ці дазваляе трэнерскі заробак не перажываць з гэтай нагоды маладому спецыялісту?**

**ДАВЕДКА «ЧЗ»**

***Шорт-трэк — від канькабежнага спорту. У спаборніцтвах некалькі удзельнікаў (чым больш дыстанцыя, тым больш спартсменаў у забегу) адначасова катаюцца па авальнай дарожцы даўжынёй 111.12 метраў. Канькі ў шорт-трэкістаў без рухомай пяткі, як у традыцыйных канькабежцаў, а лязо крыху выгнута.***

— Мне здаецца, што вопытныя трэнеры зарабляюць неблагія грошы. Што тычыцца маладых спецыялістаў, іх заробак — 2,2 — 3 мільёны рублёў. Арэнда аднапакаёвай кватэры ў Віцебску ў месяц складае ад 200 да 400 долараў. Зразумела, што ўсе грошы ідуць на аплату кватэры, і на прыемныя дробязі сродкаў не хапае. Праўда, многія маладыя трэнеры паралельна працягваюць спартыўную кар'еру, а таму яшчэ могуць неяк “трымацца” ў фінансавым плане.

**— Калі гляджу спаборніцтвы па шорт-трэку, заўжды думаю аб тым, што небяспека дзесьці побач са спартсменамі...**

— Так і ёсць! Найчасцей канькабежцаў на высокай хуткасці заносіць на віражах, дзе адбываецца шмат падзенняў. Праўда, калі ты падаеш адзін — яшчэ нічога, але калі ты ляціш, не кантралюючы сябе, у групе спартсменаў — бяда! У такія моманты можна атрымаць траўмы. Даволі часта канькабежцы “ўлятаюць” у борцікі, схаваныя за страхавачным матам. Бачыла, як хлопец так пашкодзіў нагу, што яна стала падобнай да хакейнай клюшкі. Страхоўка, безумоўна, дапамагае, але сутыкненне ўсё роўна адчуваецца. Канькабежац на лёдзе развівае хуткасць да 60 кіламетраў у гадзіну. Нягледзячы на ўсё гэта, я вярнулася ў вялікі спорт... праз 5 гадоў! Шчыра кажучы, у мяне ніхто не верыў, але на міжнародным турніры ў Оршы я паказала 7-ы вынік краіны і здзівіла не толькі спартсменаў, але і трэнераў. Цяпер актыўна рыхтуюся да першынства краіны, якое неўзабаве прыме сталічная «Мінск-Арэна». Мая мэта — трапіць у нацыянальную зборную. Гэта цалкам верагодна. Галоўнае — рупліва працаваць і верыць у свой поспех.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

Месца высадкі — зімовыя Гульні

# ДАПАМОЖАМ «АЛІМПІЙСКАЙ СЯМ'І»!

## Брэсцкія студэнты адправіліся працаваць на ўзбярэжжа Чорнага мора

**Кінуць вучобу на месяц і паехаць у Сочы? Без праблем! Студэнты брэсцкага «палітэха» выкарысталі свой шанц і адправіліся дапамагаць на зімовыя Алімпійскія гульні. Да апошняга дня было невядома, адпусцяць моладзь на падпрацоўку ці не. Далася ў знакі папяровая цяганіна — няправільна складзены дагавор паміж ВНУ і кампаніяй, якая запрашае. Аднак калі я пачула па тэлефоне радасны вокліч адной з валанцёрак, Алены Жукавай (па просьбе дзяўчыны імя і прозвішча зменены, прычыны стануць зразумелымі ніжэй): «Ура, мы ўсё ж такі едзем, сёння а сёмай вечара — цягнік», сумненні канчаткова рассеяліся. Едуць!**

### Дык праца ці валанцёрства?

Дарожны чайнік, ножык, набор сухпайка, кнігі, камплект асенняга адзення, сродкі гігіены — так Алена, будучы архітэктар, збіралася ў дарогу. Грошай шмат не брала — папярэджвалі, што ў Сочы шмат крадуць. Зімовага адзення ў валізцы няшмат: там, на ўзбярэжжы Чорнага мора, цёпла. Галоўнае — не замерзнуць у дарозе. Алена зусім не хвалявалася, бо ехала ў Сочы разам з кампаніяй сваіх сяброў — аднакурснікаў з Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Дзяўчына марыла трапіць на зімовую Алімпіяду і ёй выпаў такі шанц: у лістападзе мінулага года маскоўская кампанія абвясціла набор валанцёраў-афіцыянтаў для працы на Гульнях. Студэнтаў набіралі выключна з БрДТУ і Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, бо толькі з гэтымі ВНУ у кампаніі наладжаны кантакты. Алена, як і многія яе аднакурснікі, падала заяўку і трапіла ў лік абраных. «Калі з'явілася аб'ява пра набор валанцёраў у Сочы, пачаўся жудасны ажыятаж — разам са мной падалі заяўкі яшчэ прыблізна 150 чалавек. У мяне асабіста быў інтарэс трапіць менавіта на Алімпіяду, наведаць спаборніцтвы, падтрымаць нашу «зорку» біятлона Дар'ю Домрачаву. Таму вагацца не было прычыны, — распавяла Алена. — Вядома, гэта не валанцёрства, а праца. Аднак колькі я зараблю — не ведаю. Вось і лічу сябе валанцёрам, бо еду не дзеля грошай, а з цікавасці».

З дэканатам праблем не будзе — кіраўніцтва ўніверсітэта дало «дабро» на працу сваіх студэнтаў. Аднак навучанне ніхто не адмяняў: прапушчаныя заняткі ўсё роўна дагоняць «прагульшчыкаў» — праўда, праз месяц. «Месяц валанцёрства нам залічаць за практыку, — гаворыць Алена. — Але па вяртанні будзем вывучаць матэрыял, які прапусцілі. Нічога, справімся».

Дарэчы, кіраўніцтва ўніверсітэта адбірала самых лепшых студэнтаў — у канчатковы спіс трапілі адны бюджэтнікі. Са 150 чалавек адсеялася амаль сотня. «Самым складаным этапам падрыхтоўкі стала афармленне ўрачэбных даведак — давялося прайсці шмат спецыялістаў, доўга чакаць вынікаў аналізаў. Таму, калі доўгачаканая даведка апынулася ў маіх руках, уздыхнула з палёгкай», — кажа Алена.

### Працоўныя будні: «стрыт-фуд» і «скай-боксы»

Цікава, наколькі ж падрыхтаваная да сваёй «службы» Алена? Дзяўчына кажа, што, як і многія равеснікі, раней падпрацоўвала прамоўтарам. Гэтая праца патрабуе прамога ўзаемадзеяння з людзьмі, ветлівасці, добразычлівасці і стрэсаўстойлівасці. Патрабаванні справядлівыя і для працы афіцыянткай. Дарэчы, для адабраных валанцёраў праводзіліся азнаямляльныя лекцыі. «Зразумела, правілы паводзінаў з кліентамі і сервіроўка сталоў — гэта асновы нашай працы. Але веданне каштоўнасцяў алімпійскага руху таксама ніхто не адмяняў, — упэўнена кажа Алена. — Кожны з нас усведамляе, на якое мерапрыемства ён едзе, таму ведаць хаця б агульнае пра зімовую Алімпіяду мы павінны».

А што з графікам? Тут не ўсё так прывабна і соладка, як хацелася б. Працоўны дзень доўжыцца 10 гадзін, пяць працоўных дзён запар, а пасля ўзнагарода — адзін выхадны. Аплата жылля, праезду, харчавання — клопат фірмы. «Ведаю, што мы будзем жыць у прыватным сектары, у гатэлі — усяго паўгадзіны дабірацца да месца працы. А з сувяззю крыху накладна атрымаецца — там «ловіць» толькі «Мегафон». Гэта датычыцца як тэлефоннай сувязі, так і інтэрнэту. Як трымаць кантакт з радзімай — пакуль не прыдумала», — сумавала перад ад'ездам дзяўчына.

Што яшчэ? Дакладна вядома тэрыторыя, на якой будуць працаваць брэсцкія студэнты — гэта Алімпійскі парк, кёрлінг і фігурнае катанне. «Пакуль нас канкрэтна не замацоўвалі за нейкай «кропкай», але мы ўжо ведаем фармат сваёй працы. Абслугоўванне на вуліцы ў спецыяльных кабінках — называецца «стрыт-фуд», — пералічвала Алена. — Для VIP-персон будуць зроблены адмысловыя «скай-боксы» — гэта карпаратыўныя ложы, «важныя» аб'екты. І яшчэ ў нас ёсць цудоўная магчымасць абслугоўваць заслужаных алімпійцаў — іх называюць «алімпійскай сям'ёй».

### У кожнай зоне — свае забароны

А цяпер крышачку пра забароны — з гэтым ніхто жартаваць не збіраецца. У Аленчыным нататніку галоўныя з іх запісаны на ўсялякі выпадак — каб не забыцца. «У нас існуе падзел па працоўных зонах — чырвоная, сіняя, жоўтая і зялёная. Кожная з іх мае сваю «ступень рызыкі», — тлумачыла дзяўчына. — Мы працуем у зонах з найменшым узроўнем рызыкі — сіняй і жоўтай. Гэта азначае, што абслугоўваць можам толькі сталы і складскія памяшканні. Калі кліент упусціць талерку на падлогу, мы не маем права нават дакранацца да гэтай талеркі. Што робім у такім выпадку? Клічам валанцёра з жоўтай зоны — яны адказваюць за падлогу — і далей робім сваю справу. А ў выпадку, калі кліент разліў гарбату на стале, прыбіраемся ўжо мы, бо гэта сіняя зона. Спрачацца з кліентамі нам таксама забаронена, нават калі яны не маюць рацыі. Па прыездзе нам абяцалі даць інструкцыю «12 пунктаў па мыцці рук» — што там напісана, цяжка ўявіць. Але гучыць дужа недарэчна».

Якія яшчэ забароны давядзецца перажыць афіцыянтам? «Браць аўтографы ў спартсменаў мы не можам, — уздыхае Алена. — Шмат пункцікаў «нельга» прапісана па знешнім выглядзе — ніякіх накладных пазногцяў, гадзіннікаў, бранзалетаў, а валасы абавязкова трэба «прыбіраць». Дзяжурная форма — белы верх, чорны ніз — будзе выдавацца нам на месцы. Адзінае, што абутак давядзецца браць свой, але тут таксама ёсць патрабаванне — чорны звычайныя чаравікі».

...Ну, вось і ўсё! Рэчы сабраныя, дакументы падрыхтаваныя, праз гадзіну — цягнік. Алена тэлефануе сяброўцы — яны павінны сустрэцца разам на вакзале. Ну, у добрую дарогу! Наколькі цікавым было валанцёрства брастаўчанкі Алены Жукавай, мы даведаемся па вяртанні дзяўчыны з Сочы. Алена паабяцала занатоўваць свае думкі і цікавінкі на працягу ўсёй Алімпіяды.

**Кацярына РАДЗЮК.**

**ТЫМ ЧАСАМ У НАС**

***Крыху менш за тры месяцы засталося да яшчэ аднаго вялікага мерапрыемства, дзе таксама спатрэбяцца валанцёры, — чэмпіянату свету па хакеі, які прымае беларуская сталіца. Іх канчатковы адбор прайшоў яшчэ ў лістападзе мінулага года. Як расказаў Максім Кашкалда, менеджар па валанцёрскай праграме арганізацыйнага камітэта па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2014 года, з 3800 валанцёрскіх заявак было адабрана 1050. «Даволі многа заявак прыйшло з Латвіі, Фінляндыі, Украіны і, вядома ж, Расіі. Усяго — з 16 краін, — кажа Максім Кашкалда. — Але ў выніку большая частка валанцёраў — каля 95% — гэта беларусы. На другім месцы — расійскія валанцёры». Нямінчанам абавязкова прадаставяць жытло, для ўсіх харчаванне будзе бясплатным. Валанцёры будуць задзейнічаны ў такіх сферах, як лагістыка, акрэдытацыя СМІ, забеспячэнне праходу, гатэльная справа.***

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
13 02 2014 г.

Мы — такія!

# Вучыла дзяцей, абараняла Радзіму

### ПРА АЎТАРА

*Гэтай аўтарцы — 15 гадоў. Чым захапляецца Кацярына?*

*— Займаюся спортам, гуляю ў баскетбол, катаюся на роліках, удзельнічаю ў спартыўных спаборніцтвах. Яшчэ іграю на гітары і люблю народныя танцы. З'яўляюся кіраўніцай інтэлектуальнага клуба сярэдніх класаў. Працую ў школьным музеі, член клуба «Пошук», — гаворыць пра сябе дзяўчына. Апошняй акалічнасцю і абумоўлена тэма творчай працы аўтаркі: з лёсам настаўніка і ветэрана вайны Кацярына пазнаёмілася дзякуючы музею. Дарэчы, дзяўчына прызналася, што любіць чытаць кнігі пра вайну. «Яны пакідаюць моцнае ўражанне».*

*У будучыні Кацярына хоча быць журналістам. Чаму такі выбар? Кажа, што на факультэт журналістыкі паступілі яе старэйшыя сябры, шмат расказвалі пра вучобу, і ідэя захапіла дзяўчыну.*

**Кожны дзень аддаляе нас ад таго жахлівага часу... Кожны дзень гэтых людзей становіцца ўсё менш. Яны і ёсць наша памяць. Яны — ветэраны. Без іх мы б і не ведалі, што такое вайна і, можа, не жылі б на гэтым свеце. Мы павінны захоўваць нашу памяць, нашу гісторыю. Як казаў Уладзімір Караткевіч, без яе мы не вывем. Памяць — наша ўсё.**

Калі я даведалася пра Ніну Сцяпанаўну Бейзараву, яе жыццёвая гісторыя вельмі зацікавіла і захапіла мяне. Яна нарадзілася ў горадзе Цемнікаве. Гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі былі цяжкімі, бо ў гэты час загінулі яе бацькі — самыя родныя людзі на свеце. Маленькая Ніна засталася з бабуляй, якая яе выхоўвала. Але ж не скончыліся на гэтым беды Ніны Сцяпанаўны: бабуля таксама памерла, і дзяўчынка стала жыць у дзядзькі.

Яшчэ ў дзяцінстве яна вырашыла стаць педагогам, таму і паступіла ў Цемнікаўскі педагагічны тэхнікум. Потым жыццё кідала яе па розных мясцінах. Менавіта так яна і трапіла ў нашу Бярозаўку — па загадзе накіравацца ў Заходнюю Беларусь, каб аднавіць школы, дзе навучанне вялося на рускай мове. Тут у 1933 годзе была пабудавана сямігодка на 175 месцаў. Ніна Сцяпанаўна ў хуткім часе стала яе дырэктаркай, але доўжылася гэта зусім нядоўга...

У першыя месяцы вайны Ніна Сцяпанаўна яшчэ вучыла дзяцей. Але як толькі на Навагрудчыне разгарнуўся партызанскі рух, настаўніца актыўна ўключылася ў барацьбу з ворагам. Адметнай падзеяй у яе жыцці стала святкаванне 8 сакавіка 1943 года. Жанчыны партызанскага атрада «Іскра» на чале з Нінай Сцяпанаўнай вырашылі з групай мінёраў падарваць нямецкі эшалон. Жанчыны выканалі свой план «на выдатна».

Адважная і стойкая Ніна Сцяпанаўна здзейсніла не адну аперацыю. Пра яе ўсе казалі толькі з пашанай і павагай. Пасля заканчэння вайны яна вярнулася да педагагічнай дзейнасці, стварыла добрую, моцную сям'ю. Нягледзячы на тыя жахі, якія перажыла гэта жанчына, яна працягвала жыць. І не толькі для сябе. Яе веды і ўспаміны былі вельмі патрэбнымі малодшаму пакаленню.

На жаль, гэтага чалавека ўжо няма з намі. Але я спадзяюся, што лёс Ніны Сцяпанаўны Бейзаравай заваяваў не толькі маю павагу.

**Кацярына БУХЦІНАВА,**
**вучаніца 10 класа**
**Бярозаўскай СШ №3 Лідскага раёна.**

# МЫ — МАБІЛЬНЫЯ, КРЭАТЫЎНЫЯ, ТВОРЧЫЯ!



**На вялікі жаль, часам можна пачуць няўхвальныя водгукі пра сучасную моладзь. Маўляў, «лянівая», «бязглуздая», «бездухоўная». Так, сапраўды, сустракаюцца асобныя прадстаўнікі, якія нічым не цікавяцца, не імкнуцца да ведаў, для якіх праца і вучоба — гэта цяжкая павіннасць. Але іх, некаторых, нельга атаясамляць адразу з усім маладым пакаленнем. У сваім лісце я хачу стаць на абарону маладых і расказаць пра наша пакаленне на прыкладзе свайго ўласнага жыцця.**

У свае шаснаццаць гадоў я пабывала ў розных гарадах і шматлікіх краінах, я ўдзельнічала ў разнастайных конкурсах, прадметных алімпіядах і спартыўных спаборніцтвах. І, ведаеце, я зрабіла для сябе адну важную жыццёвую выснову: нельга сядзець на адным месцы, трэба ўвесь час рухацца наперад, развівацца, самаўдасканальвацца і дасягаць мэты. І галоўнае — спрабаваць сябе ў самых розных кірунках і ніколі не кідаць пачатай справы, а заўсёды даводзіць яе да канца.

Пачынаючы з малодшых класаў, я ўдзельнічала ў самых розных школьных алімпіядах па прадметах, якія часта нават не з'яўляліся сумежнымі: гісторыя і хімія, біялогія і геаграфія, грамадазнаўства і беларуская мова. Мне хацелася знайсці той прадмет, які б стаў першай прыступкай на шляху да авалодання будучай прафесіяй. Усё гэта разам спрыяла пашырэнню кругагляду і маіх інтарэсаў.

Значная роля ў маім жыцці належыць спорту. Спорт для мяне — не толькі здаровы лад жыцця і актыўны адпачынак, а сапраўдная школа выхавання асобы. Спорт загартоўвае волю, вытрымку, мэтанакіраванасць, выхоўвае ўменне дзейнічаць зладжана ў адной камандзе.

З пятага класа я захапілася валейболам і лічу, што гэта самы займальны і цудоўны від спорту. Ён выхоўвае нас не толькі фізічна. Калі трапляеш у каманду, даводзіцца гуляць з рознымі людзьмі (асабліва калі яе склад часта мяняецца), і даводзіцца так наладжваць свае адносіны, каб знайсці да кожнага члена каманды свой падыход. Падчас гульні ўласныя амбіцыі адыходзяць на другі план, важная толькі агульная мэта — перамагчы.

...Прыгадваю самыя яркія моманты нашых спаборніцтваў. Гульня хутка скончыцца, і толькі адзін мяч аддзяляе нас ад жаданай перамогі. Але сіл амаль што не засталося, таму даводзіцца напружваць усё сваё цела, каб выстаяць у спартыўным процістаянні. І вось, нарэшце, такі жаданы — кантрольны мяч. Ён трапляе на пляцоўку саперніка... О, Божа, які выбух пачуццяў! Ты кідаешся да кожнага, абдымаеш, цалуеш, крычыш ад радасці і нават плачаш ад шчасця, а твае сяброўкі па камандзе становяцца самымі дарагімі людзьмі ў свеце. А пасля, калі эмоцыі сціхнуць, пачынаеш разумець: вось гэта менавіта тая мэта, якая апраўдвае сродкі. Усе сілы, прыкладзеныя для перамогі, былі не марнымі. Таму спорт прыносіць яшчэ і радасць, і шчаслівыя моманты жыцця. Гульня, якая патрабуе згуртаванасці, робіць нас сябрамі і ў паўсядзённым жыцці. І за гэта я ўдзячная спорту!





Жыццё сучаснага чалавека вызначаецца мабільнасцю і хуткасцю атрымання інфармацыі. Інтэрнэт — не толькі энцыклапедыя, якая дае адказы на ўсе пытанні, гэта і адзін з самых распаўсюджаных сродкаў зносін паміж людзьмі. Знаходзячыся на вялікай адлегласці адзін ад аднаго, мы маем выдатную магчымасць віртуальна весці гутарку, абменьвацца думкамі. Усё больш і больш людзей карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі. Я — не выключэнне. У сецібе мы не толькі падтрымліваем сувязі, але і знаходзім новых сяброў, маем магчымасць падзяліцца сваімі думкамі і падзеямі, што адбываюцца вакол нас і з намі. Нешта новае мы бачым упершыню, нам гэта падабаецца, і так узнікаюць новыя захапленні.

Эра новых тэхналогій стымулюе і ўзнікненне новых захапленняў. Ужо з поўнай упэўненасцю можна адзначыць той факт, што ў мастацтве ўзнікла такое паняцце, як лічбавая фатаграфія. Галоўнае адрозненне яе ад звычайнай у тым, што цяпер стала магчымым надаваць асаблівую ўвагу дробным дэталям. Так я захапілася стварэннем фота, на якіх адлюстраваны прыгожыя пейзажы ці шчаслівыя моманты жыцця. Маю ўвагу прыцягнулі кветкі, жывёлы і сябры.

Хацелася б расказаць яшчэ пра адну цікавую старонку майго жыцця. Гэта ўдзел у творчых песенных конкурсах. Сцэна заўсёды мяне вабіла. Здаецца, там ты ператвараешся ў сапраўдную казачную фею, каб дарыць людзям радасць і ўсмешкі.

**Нельга сядзець на адным месцы, трэба ўвесь час рухацца наперад, развівацца, самаўдасканальвацца і дасягаць мэты. І галоўнае — спрабаваць сябе ў самых розных кірунках і ніколі не кідаць пачатай справы.**

Неаднаразова даводзілася быць вядучай раённых творчых конкурсаў, між іншым гэта таксама цудоўная школа выхавання характару, умення валодаць сабой, весці дыялог з аўдыторыяй і кіраваць яе настроем і памкненнямі.

Жыццё маладога пакалення цікавае, займальнае, насычанае падзеямі і прыемнымі сустрэчамі. Мы — прадстаўнікі маладога пакалення — мабільныя, крэатыўныя, творчыя, мэтанакіраваныя, камунікатыўныя. Мы ведаем, чаго хочам. Мы розныя, але ўсіх нас аб'ядноўвае неадольнае жаданне самарэалізавацца ў жыцці, здзейсніць свае мары і дасягнуць поспеху!

**Яніна МІНЕНКА, вучаніца 11 класа**
**Лельчыцкай сярэдняй школы № 1.**
**Фота аўтара.**



### ПРА АЎТАРА

Яніна мае рознабаковыя інтарэсы і здольнасці. Яна пераможца раённай алімпіяды па грамадазнаўстве (першае месца летась і другое месца — у 2012 годзе). З'яўляецца капітанам валейбольнай каманды, захапляецца фотаздымкамі. Заняла другое месца ў абласной алімпіядзе па краязнаўстве, першае месца ў абласных спаборніцтвах па валейболе. На раённым фестывалі творчасці «Зорны дождж» заваявала другое месца ў намінацыі «вакал».

Пра ўсе гэтыя свае захапленні Яніна і напісала ў конкурснай рабоце. Не стала разважаць агулам, якой была ці можа быць сучасная моладзь, а на ўласным прыкладзе паказала, якая яна ёсць, прынамсі, асобныя яе прадстаўнікі. Нехта можа сказаць, што гэта нясціпла. Смелаесць, як той казаў, гарады бярэ! Матэрыял цалкам адпавядае ўмовам конкурсу, бо мы і прасілі напісаць, якая моладзь, на канкрэтных прыкладах, а не праз агульныя разважанні. У якасці такой канкрэтнай асобы аўтарка выбрала саму сябе — мела права. А ўвогуле, нам здаецца, што дэвіз Яніны — нельга сядзець на адным месцы, неабходна рухацца наперад, развівацца, самаўдасканальвацца і дасягаць мэты — цалкам адпавядае, як яна і напісала ў працы, мабільным, крэатыўным, творчым, мэтанакіраваным і камунікатыўным людзям свайго часу! Так трымаць!

# КАБ НІКОЛІ НЕ ПАЎТАРЫЛАСЯ

## (Пісьмо сябру)

Добры дзень, дарагі Міша! Як ты жывеш? Як справы? Чым займаешся? У мяне ўсё добра. Вучуся. Пішу табе для таго, каб распавесці пра гісторыю. Мяне вельмі закранула тэма Вялікай Айчыннай вайны, яе падзеі. Думаю пра Вялікую Перамогу... Пра Перамогу нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Думаю пра тыя цяжкія часы, пра цяжкія лёсы людзей, пра іх подзвігі, пра іх гераізм. У сэрцы кожнага з нас ёсць свае думкі і пачуцці, свае ўяўленні пра вайну. Вайна пакінула свой след у кожнай сям'і, у кожным з нашых сэрцаў.

Са слоў майго прадзеда Мірона Васільевіча Алешкі, які прайшоў усю вайну з першага да апошняга дня, я ведаю, што гэта быў вельмі суровы час. Прадзед нарадзіўся 19 жніўня 1915 года ў вёсцы Мілашавічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці, перад вайной працаваў у калгасе «Чырвоны дазор». Ажаніўся, меў дваіх дзяцей. Гэта была яго першая сям'я, якая загінула падчас вайны.

